ПОЛОЦКИЙ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЙ МУЗЕЙ-ЗАПОВЕДНИК
МУЗЕЙ-БИБЛИОТЕКА СИМЕОНА ПОЛОЦКОГО

Симеон Полоцкий: мировоззрение, общественно-политическая и литературная деятельность

(материалы Международной научной конференции 11-12 ноября 1999 г.)

ПОЛОЦКИЙ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЙ МУЗЕЙ-ЗАПОВЕДНИК
МУЗЕЙ-БИБЛИОТЕКА СИМЕОНА ПОЛОЦКОГО

Симеон Полоцкий: мировоззрение, общественно-политическая и литературная деятельность

(материалы Международной научной конференции 11-12 ноября 1999 г.)

Полоцк 1999

Составитель: Песина И.Е. - ведущий научный сотрудник
Музея-библиотеки Симеона Полоцкого.

Симеон Полоцкий: мировоззрение, общественно-политическая и литературная деятельность// Материалы Международной научной конференции. - Полоцк: Полоцкий историко-культурный заповедник, Музей-библиотека Симеона Полоцкого, 1999.

Компьютерный макет и вёрстка Пескин А.В.

Г. Полоцк, ПП «Наследие Ф.Скорины». Заказ 6340. Тираж 50 шт.

11-12 ноября 1999 года в Полоцком историко-культурном музее- заповеднике состоялась Международная научная конференция «Симеон Полоцкий: мировоззрение, общественно-политическая и литературная деятельность» (к 370 -летию со дня рождения)

Учёные, сотрудники архивов, библиотек, музеев Москвы, Санкт-Петербурга, Минска, Могилева, Полоцка отмечают, что проведение данной конференции стало заметным событием в научной и культурной жизни.

Тематика конференции охватывала проблемы духовного и литературного наследия Симеона Полоцкого, исторической взаимосвязи славянских культур XVI-XVII вв., педагогический аспект деятельности Симеона Полоцкого, духовное и культурное наследие христианства на Беларуси.

Участники конференции отмечают закономерность создания Музея-библиотеки в бывшей Братской школе Богоявленского монастыря, где преподавал Симеон Полоцкий. Открытие не просто музея Симеона Полоцкого, а музея-библиотеки весьма логично. Посетители могут не только ознакомиться здесь с экспозицией, посвященной просветителю и гуманисту XVII века, но и в прямом смысле ощутить себя в той эпохе, благодаря соответственно оформленному интерьеру и возможности пользования богатым книжным фондом музея, в том чис-

ле и прижизненными изданиями Симеона Полоцкого.

Одобрить традицию проведения на базе Музея-библиотеки Симеона Полоцкого международных научных конференций, в том числе посвященных Симеону Полоцкому, его мировоззрению, общественно-политической и литературной деятельности. Периодичность проведения- 1 раз в 5 лет.

От имени участников конференции обратиться к Министерству культуры России, Министерству культуры Республики Беларусь, библиотекам, архивам России с просьбой оказания содействия в пополнении экспозиции единственного в мире музея, посвященного жизни и деятельности Симеона Полоцкого.

Выйти с предложением в Министерство культуры Республики Беларусь, Витебский облисполком, Полоцкий горисполком об ускорении реализации проекта по установке памятника Симеону Полоцкому на его родине.

Обратиться в Министерство культуры Республики Беларусь, Госкомитет по печати с предложением об издании в 2000 году буклета о музее-библиотеке Симеона Полоцкого.

Внести на рассмотрение Полоцкого горисполкома предложение о присвоении одной из улиц города имени Симеона Полоцкого.

НАРОДНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В МОСКВЕ XVII В.

Аверьянов К.А.,
(г.Москва)

XVII в. стал особым временем в истории московскою народного образования, когда со всей остротой было осознано то, что обучение грамоте у своих «доморощенных» учителей, пополнение знаний путем чтения и самообразования не является достаточным. Впервые был поставлен вопрос о необходимости дальнейшего развития системы просвещения, то есть о возможности перехода от преимущественно домашнего обучения, где давались лишь самые начальные знания, к более высоким ступеням образования - специально созданным училищам, где преподавались бы отдельные предметы и иностранные языки. После Смутного времени Россия продолжает налаживать связи с Европой. Но для этого нужны были не просто грамотные, но и образованные люди, знающие помимо прочего и иностранные языки. Знание латинского языка как международного средства общения было крайне необходимо. Всего этого прежняя школа дать не могла. Процесс перехода к новым формам обучения, начавшийся еще в XVII в., растянулся на столетие с лишним и завершился много позже, уже после кончины великого реформатора России Петра I.

Уже со второй четверти XVII в. в Москве начинают возникать подобные школы. Однако сведения о них крайне скудны. В 1632 г. при Чудовом монастыре в Кремле была открыта на средства патриарха одна из первых греко-славянских школ, в которой обучали греческому и славянскому языкам, грамматической «хитрости», риторике и философии. Но уже в 1634 г. со смертью своего организатора монаха Иосифа, приехавшего на Русь из Александрии, она, вероятно, прекратила свое существование и в документах более не встречается.

Другим очагом московского просвещения стала Немецкая слобода на Яузе. Её население составляли купцы, среди которых преобладали голландцы и немцы из Гамбурга, а также «служилые иноземцы» - военные, медики и мастера разных специальностей, получавшие «государево жалованье». Военные несли службу в полках нового строя; аптекари, лекари и доктора обслуживали царскую семью, московскую знать и армию; ювелиры, кузнецы, оружейники, часовщики, живописцы - царский двор и казну. Сравнительно рано (с 1621 г.) здесь появляется школа для детей иноземцев, существовавшая на протяжении всего столетия. Но учились там и некоторые из русских. В частности, в 1678 г. были специально присланы два подростка для обучения «латинскому и цесарскому (т.е. немецкому. -Авт.) языку для аптекарского дела».

Так же, как и в XVI в., огромную роль в деле московского образования сыграло книгоиздание - выпуск учебной литературы. Наиболее известной учебной книгой XVII в. был, без сомнения, Букварь подьячего Василия Бурцева. Он был издан впервые в 1634 г. гигантским по тому времени тиражом - почти в 3000 экземпляров, а уже через три года потребовалось его новое издание. Всего же на протяжении XVII столетия он переиздавался несколько раз. Любопытна в этом плане сохранившаяся до нас опись книг Печатного Двора, числившихся на его складе в 1649 г. Первое место среди них занимает именно Букварь Бурцева. Обращает на себя внимание и его дешевизна. Он продавался в розницу всего за 2 деньги, т.е. по 1 копейке. Такая цена делала его доступным для широких масс. Но Букварь не был единственным учебным изданием. Тем же Бурцевым в 1630-е гг. были изданы Святцы, Апостол, Псалтырь, Часослов -последние две книги широко использовались при обучении чтению. Всего же Василием Бурцевым было издано 17 книг.

В отличие от предшествующего столетия кроме бук-

варей и азбук начинают выходить и другие учебные пособия. Так, в середине XVII в. была издана «Грамматика» Мелетия Смотрицкого, вышедшая позднее в сокращенном варианте специально для школьников. В конце века печатается Букварь монаха московского Чудова монастыря Кариона Истомина. В 1682 г. в свет выходит таблица умножения, из названия которой ясно указывалась её практическая цель: «Считание удобное, которым всякий человек, купующий или продающий, зело удобно изыскати может число всякие вещи». Интересно, что в ряде книг, использовавшихся в виде пособий при обучении чтению, появляются и методические руководства для учителей. В одной Псалтыри, изданной в Москве в 1645 г., имеется «Наказание учителям, как обучать детей грамоте», где требуется, в частности, различать произношение двух сходных букв - «е» и «ять»: «зазорно и укорно «еже» (т.е. «е») вместо «ести» («ять») глаголати».

От XVII в. до нас дошли первые подробные сведения и о профессиональном образовании. В этот период наблюдается значительная специализация ремесла: только в Москве насчитывалось до 250 различных ремесленных специальностей. Для постройки каменных церквей и зданий нужны были более совершенные приемы строительной техники. Уже в XV в. в Москве пользуются часами, а для их починки от мастеров требовалось умение изготовлять детали часового механизма. Без знания прикладной физики нельзя было обойтись в кузнечном деле, литье колоколов и пушек, чеканке монет. При лечении были необходимы сведения по медицине. В ряде случаев из-за границы приглашали специалистов, но также готовили и собственных мастеров.

Обучение ремеслам носило индивидуальный характер и сопровождалось «жилыми записями» на ученичество. Они предусматривали овладение того или иного мастерства, устанавливали взаимные обязательства ученика и мастера, вознаг-

раждение и оплату труда сторон. Обычный срок постижения ремесла, которое зачастую сопровождалось и обучением фамоте, составлял пять лет.

Важным рубежом в развитии московского просвещения стало царствование второго государя из династии Романовых - Алексея Михайловича. Огромную роль в этом сыграл один из близких царю людей - окольничий Федор Михайлович Ртищев. В возобновленном им в 1648 г. Андреевском монастыре близ Воробьевых гор, в двух верстах от тогдашнего города (в районе современной площади Гагарина), он открыл училище, куда пригласил из Киева учёных монахов, чтобы организовать обучение «языкам славянскому и греческому, наукам словесным до риторики и философии».

Москвичи по-разному отнеслись к этому нововведению. Одни, только лишь из одного угождения царскому любимцу, отправили учить своих детей к «киевским старцам». Будущий думный дьяк Л.Т. Голосов, тогда ещё юноша, жаловался о подневольности учения: «Старцы де не добрые, он де в них добра не познал и доброго ученья у них нет: ныне де он манит Федору Ртищеву, боясь его, а впредь де учиться никак не хочу». Другие же, наоборот, увлеклись малоизвестной в Москве греческой и латинской грамотой, хотя и признавали, что «в той грамоте и еретичество есть», и даже просились для продолжения образования в Киевскую академию. Двоих из них Ртищев отправил учиться в Киев.

В целом же успех начинания Ф.М. Ртищева был очевиден. Показательно и то, что он не был одинок в стремлении завести школы. На рубеже 40-50-х годов XVII в. благодаря греческому старцу Арсению возобновляет свою деятельность школа при Чудовом монастыре. В ней преподавался как греческий, так и латинский языки. В 60-е годы XVII в. она именовалась «Алексеевской школой» (по имени митрополита Алексея, основателя Чудова монастыря). Тогда же существо-

вала школа при церкви Введения в Барашах, устроенная на собственные деньги местным священником Иваном Фокиным.

Эти и другие новые школы устраивались уже по новому образцу. Так, учащиеся школы в Мещанской слободе под руководством своего учителя Ивана Волошенинова занимались помимо прочего театральным делом и смогли дать на сцене придворного театра ряд представлений. В 1666 г. прихожане церкви Иоанна Богослова в Китай-городе подали челобитную о разрешении создать при храме школу по образцу украинских братских училищ, чтобы в ней было «устроение учения... различными диалекты: греческим, словенским и латинским». Власти разрешили открытие «гимнасиона», «да трудолюбивые спудеи (студенты. - Авт.) радуются о свободе взыскания и свободных учений мудрости». И хотя дальнейшие сведения об этой школе весьма скупы, самая мысль о создании «гимнасиона» показывает, что идеи Федора Ртищева упали на плодородную почву. В этом же русле следует рассматривать и решения Собора 1666-1667 гг., прямо повелевшего, «чтобы всякий священник детей своих научил грамоте».

Непосредственным же продолжением дела самого Ф.М. Ртищева, назначенного в 1664 г. воспитателем наследника престола царевича Алексея Алексеевича, стало создание Заиконоспасского училища (школы), расположившегося в центре Китай-города, в Заиконоспасском монастыре на Никольской улице, от которого и получило свое название. Из него выросла впоследствии знаменитая Славяно-греко-латинская академия. Училище было открыто в 1664 г. по указу царя Алексея Михайловича с целью подготовки кадров для различных московских приказов, в первую очередь Приказа тайных дел, представлявшего собой личную канцелярию государя. При монастыре были построены особые деревянные хоромы, предназначавшиеся специально для училища.

Руководить новым учебным заведением доверили вы-

ходцу из Белоруссии Симеону Полоцкому, выдающемуся просветителю, оратору и поэту своего времени. Он же одновременно числился и «строителем» Заиконоспасского монастыря. В числе учителей были архимандрит Дионисий и Епифаний Славинецкий. Последний примечателен тем, что составил славяно-греческий словарь. Учащиеся были набраны из молодых подьячих разных приказов. Первых четырех учеников, которым следовало учиться «по латыням», назначил сам царь.

Важнейшей заслугой Симеона Полоцкого явилось то, что несмотря на активное противодействие, ему удалось воспитать целую плеяду учеников, которые продолжили его кипучую деятельность за распространение образования, борьбу с той средневековой косностью и неподвижностью, в которой застывала тогдашняя московская жизнь.

Нужда в образованных выпускниках школы была настолько велика, что сразу же после окончания учебы двое из них были направлены с дипломатической миссией А.Л. Ордин-Нащокина в Курляндию. Одним из них оказался любимый ученик Симеона Полоцкого подьячий Приказа тайных дел Семен Медведев, сменивший сю на посту руководителя школы в 1669 г., впоследствии постригшийся в монахи под именем Сильвестра и сыгравший большую роль в деле московского просвещения.

Но в судьбы школы постоянно вмешивалась политика. Первый её выпуск совпал с осуждением на церковном соборе патриарха Никона, стремившегося к утверждению первенства духовной власти над светской. Его противники во главе с новым патриархом Иоасафом утверждали, что знания порождают смуту в умах, «многая мудрость» рождает и «многую ересь». В этих условиях говорить о дальнейшем развитии школы, её преобразовании в высшее учебное заведение, было достаточно сложно. Все же царь Алексей Михайлович поручает написать Симеону Полоцкому проект устава, а на содержание

будущей Академии велел «приписать» несколько монастырей. Но противники не дремали, им удалось убедить царя в ненужности новых «еретических» затей, и разговоры о её создании заглохли на несколько лет.

Тем не менее образование в Москве продолжало развиваться. В 1681 г. патриарх Иоаким открыл при Печатном Дворе школу, предназначенную для учеников разных сословий. Преподавал в ней русский иеромонах Тимофей, хорошо знавший греческий язык и долгое время проживший на Афоне и в Палестине. В первый год её существования в школе обучалось греческому языку 30 человек, в 1685 г. - уже 56, в следующем - 66. Кроме того, 166 человек училось русскому языку. Всего, таким образом, в ней было 232 ученика.

Зимой 1682 г. Сильвестр Медведев подает царю Федору Алексеевичу новый проект создания Академии. По его замыслу первое высшее учебное заведение в России должно было стать свободным от церковного влияния (разумеется, в понятиях того времени), иметь, автономию в управлении. В учебную программу включалось преподавание славянского, греческого, латинского языков (откуда и название самой Академии), грамматики, риторики, поэтики, математики, астрономии, геометрии, диалектики, логики, этики, богословия, светской и церковной юриспруденции, медицины и «прочих всех свободных наук». Но царь вскоре скончался, затем последовали стрелецкий бунт и очередная смута. Сильвестр Медведев бежал из Москвы. Только в 1685 г., когда у власти утвердилась царевна Софья, которую обучал Симеон Полоцкий, Медведев возвращается в Москву и подает правительнице «Привилей» - проект создания Академии. Но полностью провести его в жизнь ему не удалось. Патриарх Иоаким предлагает несколько другой план - преобразован, школу при Заиконоспасском монастыре в Славяно-греко-латинскую академию. В итоге был принят именно он.

По плану Академия должна была давать не только духовное, но и широкое общее образование: «...ими бо возможно обрести свет разума души». В её программу входил весь цикл средневековой схоластической школы, начиная от грамматики и кончая философией «разумительной, естественной и нравной». Система обучения делилась на три ступени. В низшей обучали письму и чтению на славянском и греческом языках, в средней преподавали грамматику и латынь, а в высшей изучали риторику, диалектику, логику и физику.

Возглавить Славяно-греко-латинскую академию были приглашены по рекомендации восточных патриархов ученые-теологи братья Иоанникий и Софроний Лихуды. Сначала они поселились на той же Никольской улице, в Николаевском греческом монастыре, затем - в кремлёвском Чудовом, а позднее для них были поставлены деревянные кельи в Богоявленском монастыре. Ректоры Академии одновременно были и настоятелями Заиконоспасского монастыря. Интерес в Москве к новому начинанию был огромен. Ещё до официального открытия Академии, пока строилось её здание, в конце 1685 г. начались регулярные занятия при Богоявленском монастыре с несколькими учениками типографского училища. В декабре 1685 г. было уже 28 учеников, а в следующем году - 32, из которых 6 были аттестованы как «лучшие».

Наконец, в октябре 1687 г. в Заиконоспасском монастыре открылась и сама Академия, получившая название Славяно-греко-латинской. Первый набор 1687 г. составили 104 студента, на следующий год было принято 163 человека, а в 1689 г. - 182 слушателя. В Академию охотно поступали представители московской знати. Среди учеников были два сына боярина князя Ю.М. Одоевского, сын кравчего князя Б.А. Голицына, сын дьяка В. Постникова, впоследствии доктор медицины Падуанского университета-П.В. Постников.

Тем не менее становление Академии происходило с

большими трудностями. В 1689 г. правительство Софьи пало, к власти пришел Петр I, и Сильвестр Медведев был арестован как приспешник Софьи, а в феврале 1691 г. казнен. В 1694 г., по наветам недоброжелателей и противников светского образования были отстранены от преподавания и братья Лихуды. Все же их дело не пропало. Преподавание в Академии продолжили русские ученики Лихудов, Федор Поликарпов и Николай Семёнов.

Хотя Академия имела характер духовного учебного заведения и дала церкви многих просвещенных иерархов и проповедников, огромное число её выпускников действовало именно на светском поприще. Достаточно упомянуть, что в разные годы её окончили знаменитый ученый-энциклопедист М.В. Ломоносов, поэт В.К. Тредиаковский, сатирик А.Д. Кантемир, издатель первой русской «Арифметики» Л.Ф. Магницкий, основатель русского театра Ф.Г. Волков, путешественник С.П. Крашенинников, изобретатель секрета русского фарфора Д.И. Виноградов. Академия просуществовала на Никольской улице вплоть до 1814 г., когда была преобразована в Московскую духовную академию и переведена в Троице-Сергиеву лавру.

За несколько первых столетий существования российской столицы московское просвещение прошло сложный и длительный путь своего развития. На нем встречались и тяготы, и трудности, и поражения, и непонимание, и даже противодействие окружающих. Но как ни трудна была эта дорога, неприметная на первый взгляд деятельность людей, стремившихся к образованию и просвещению своих современников, всё же приносила свои плоды. Наступало XVIII столетие, вошедшее в историю под названием «Век просвещения».

ГІМНАГРАФІЧНАЯ СПАДЧЫНА Ф. СКАРЫНЫ Й С. ПОЛАЦКАГА.

Баўтовіч М.,
(г. Полацак)

Пачынаючы разгляд гімнаграфічнае спадчыны Ф. Скарыны й С. Полацкага мушу адзначыць, што маю тут на ўвазе збольшага акафісты. Удакладненьне гэтае неабходнае, бо знаходзім сярод твораў надрукаваных Ф. Скарынам і тых, што знаходзяцца ў рукапісу С. Полацкага гэтаксама каноны, стыхіры, трапары.

Напачатку азнаёмімся з стылёвымі асаблівасьцямі акафісту, паспрабуйма наблізіцца да вытокаў жанру, высьвятліць аўтарства першага твору. Акафіст, як адзін з жанраў хрысьціянскае гімнаграфіі мае свае карані ў бізантыцкай культуры VI-VIIстст. Па - грэцку назва гучыць як «"imnos akafistos», што значыць «хваласьпеў, які трэба сьпяваць стоячы». Традыцыя вядзецца ад таго часу, калі жыхары Канстантынопалю ў падзяку Багародзіцы за абарону места ад барбараў праз усю ноч, стоячы, пяялі хваласьпеў, які завецца цяпер акафістам да Багародзіцы. Сьпяваецца акафіст звычаем у пятую суботу Вялікага Посту, якая з гэтае прычыны мае назву акафіставай, а сынаксар на гэты дзень мянуе яго «песьняй несядальнаю». Акафіст да Багародзіцы лёг у падмурак цэлага жанру. Пачынаецца твор зь першага кандаку, які мае ўласную назву «кандак сьвята Дабравешчаньня» і сьпяваецца асобна 25-га сакавіка. Пасьля яго зьмешчаныя яшчэ дванаццаць ікасаў і дванаццаць кандакоў. Звычайна па сканчэньні прамаўляецца пасьляакафіставая малітва. Кандак (kontakion) перакладаецца з мовы грэцкае як «скрутак» пэўна ад першаснае формы захоўва-ньня хрысьціянскіх хваласьпеваў і зьяўляецца кароткім урыўкам з жыцьця сьвятога, да якога з мольбамі зьвяртаюцца

вернікі, ці выкладам тэалягічных дагматаў. Замыкае кандак традыцыйна вокліч «Алілуя!» Ікас (oykos) - большая за кандак складовая частка, назва якой перакладаецца як «дом», што на думку дасьледнікаў адбылося ў выніку літаральнага перакладу з сырскае мовы слова «beth», якое мае два сэнсы «дом» і «страфа». Першая частка ікасу сэнсоўна зьяўляецца працягам таго, пра што распавядаецца ў кандаку. Ніжэй зьмешчаныя дванаццаць хайрэтызмаў (ад грэцкага «chayre»- радуйся, вокліча, якім пачынаецца кожны радок), злучаных рыфмаю ў пары, апошні хайрэтызам - рэфрэн, аднолькавы для ўсіх ікасаў. Рэфрэн гэты працінае твор, зьнітоўваючы яго ў вадно цэлае. Ёсьць ён апрача ікасаў і ў першым кандаку, які мае яшчэ адну назву «каптур». Лічба дванаццаць, а менавіта столькі ў акафісьце ікасаў і кандакоў без уліку «каптуру», на мове лічбавога сымбалізму азначае завершаную поўнасьць і Валадарства Божае на зямлі, бо ўтвараецца памнажэньнем трох (Сьв. Тройца) на чатыры (стыхіі). Прыгадайма тутака колькасьць радоў Ізрайлевых, апосталаў Хрыстовых, брамаў Ерусаліму Нябеснага (Адкрыцьцё 21: 12-21). Такім чынам спалучэньне колькасьці ікасаў з колькасьцяй хайрэтызмаў у іх дае дасканаласьць, памножаную на саму сябе й разам з альфабэтным грэцкім гранавершам ад Альфы да Амэгі мусіць засьведчыць, што Госпад наш Ісус Хрыстос ёсьць найвышняю дасканаласьцяй. Ён «... Альфа й Амэга, пачатак і канец, першы й апошні...» (Адкрыцьцё 22: 13) - вось сымбалічны й зьместоўны сэнс усяго твору. Падзяляецца акафіст умоўна на дзьве часткі: гістарычную, дзе зьмешчанае апісаньне падзеяў, зьвязаных з прыйсьцем Хрыста ў гэты сьвет, і дагматычна-маральную, у якой тлумачыцца глыбінны сэнс таго, пра што напісана ў першай палове твору. Парныя хайрэтызмы, як пазначана вышэй ахопленыя рыфмаю тыпу гомэатэлеўту, што ўтвараецца праз пастаноўку ў канцы радкоў словаў з аднолькавымі канчаткамі і надае акафісту яшчэ большую прыгажосьць і вытанчанасьць. Хаця перакладчыкі яго на лацінскую

й славянскую мовы на жаль ня здолелі захаваць гэтае адметнасьці, але менавіта адсюль бярэ пачатак эўрапейская танічная паэзія. Таму з гледзішча формы й зьместу акафіст да Багародзіцы ўяўляе ўнікальны ў сваёй дасканаласьці твор, нездарма ж грэцкая традыцыя называе Акафістам толькі гэты твор (яго й мы будзем далей гэтак менаваць). Усе пазьнейшыя творы гэтага жанру завуцца ікасамі. Вялікі знаўца Ўсходняе Царквы князь Максымільлян Саксонскі пісаў: «Акафіставы гімн належыць да найслаўнейшых паэтычных твораў усяго грэцкага сьвету». Уплыў Акафісту на лацінскую культуру можна бачыць і сёньня ў літаніях, што пераянялі форму ікасаў.
Час напісаньня Акафісту дакладна не вядомы, але прамежак часу можна вызначыць, калі прыняць да ўвагі, што тэалягічна - дагматычны зьмест Акафісту стаўся мажлівым толькі пасьля трэцьцяга Сусьветнага Сабору ў Эфэсе, які адбыўся ў 431г. й прызнаў сьв. Марыю за Багародзіцу. Верхняя мяжа акрэсьленая тым, што напрыканцы VIIIст. Акафіст быў ужо перакладзены на лацінскую мову бенэдыктынамі ў манастыры сьв. Гала(†645г.) (Сэнт-Галэн, сучасная Швайцарыя) і ў якасьці галоўных ворагаў хрысьціянскае веры аўтар твору называе агняхвалаў-зарастрыйцаў, а не сарацынаў(арабаў) носьбітаў ісламу. Такі стан захоўваўся да 651г., калі абрынулася ў друз сасанідзкая дзяржава, і нават менш таго, да 630-640гг., часу ўдалых заваёваў Абу Бэкра й Амара. Да таго ж «каптур» Акафісту згадвае пра выбаўленьне ад чужынцаў, якія непасрэдна пагражалі Канстантынопалю. У вызначаных хрaналягічных рамках гэткія варункі склаліся ўлетку 626г., калі сталіца была ледзь уратаваная ад войскаў обраў і пэрсаў. Паводле старой сынаксарнае заўвагі Акафіст першы раз сьпявалі 7 жніўня 626 году. Такім чынам ў 626 годзе быў напісаны «каптур», які пачынаецца словамі «Te “Ipermacho Stratego...» (Табе Ваявода Ўсепераможная...), і быў урачыста прасьпяваны Акафіст, але з гэтага не вынікае, што тады ж быў напісаны

сам твор. Ёсыдь падставы думаць, што напісаны ён раней, а 7 жніўня 626г. ня дата напісаньня Акафісту, але мяжа, што акрэсьляе час, і пазьней за якую твор ня мог зьявіцца.

Вызначыць аўтара гэтага дзівоснага твору ня менш складана чым час напісаньня. Зь вядомых гістарычных асобаў найчасьцей згадваюць Рамана Міласьпеўца (Melodos) й Гэорга Пісыду. Раман Міласьпевец (†555г.) нарадзіўся ў сырыйскім месьце Эмэсе, быў дыяканам у Бэйруце. На пачатку VIIст. зьявіўся ў Канстантынопалі. Знакамітым стаўся праз стварэньне кандакоў, якіх напісаў блізу тысячы. Захавалася ж зь іх толькі 85. Вернікам вядомыя ягоныя кандакі на Раство: «Дзева сёньня Над'існага нараджае... » і на Вялікдзень: «Хаця й у магілу зыйшоў... ». Азначаныя кандакі на самой справе ёсьць толькі зачынамі значна большых твораў, што мелі такую самую назву. Гэтыя Раманавы кандакі складаюцца з 18-24 строфаў (ікасаў), аб'яднаных аднолькаваю мэтрычнаю будоваю й скразным рэфрэнам. Зачын твору ці «каптур» меншы памерам за ікасы й мае іншую структуру, але з тым самым рэфрэнам. Першыя літары «каптуру» і ікасаў звычайна ўтвараюць granaверш: «Твор ціхмянага Рамана» ці іншы падобны выраз. Мэтрыка кандакоў сылабічная з даволі пасьлядоўным улікам тонікі. Такім чынам Акафіст і кандакі Рамана Міласьпеўца маюць у будове шмат агульных рысаў: колькасьць строфаў, скразны рэфрэн у ікасах, мэтрыку, granaверш. Розьніцца ж Акафіст большай унутранай вытанчанасьцяй і наяўнасьцяй меншых строфаў (кандакоў) і хайрэтызмаў.

Гэорг Пісыда - дыякан і хартафілак канстантынопальскай катэдральнае цэрквы сьв. Сафіі (610-638гг.). У сваіх творах апяяў перамогі імпэратара Гэракла І. Шырока вядомы ягоны твор «Вайна з обрамі», у якім апісаныя падзеі 626 году й аблога Канстантынопалю обрамі ды пэрсамі. Таксама Пісыду належыць «Шасьцідзён ці пра стварэньне сьвету». Гэты вялікі паэтычны твор (1894 радкі) разам з «Шасьцідзёнам» Базыля

Вялікага быў у тыя часы надзвычай папулярны. Пісаў свае творы Пісыда 11-радковым ізасылабічным вершам. Як відаць паэмы Пісыды зьвязаныя з Акафістам храналягічна, але не стылёва. Таму з двух паэтаў Раман Міласьпевец ёсьць больш верагодным аўтарам. Зусім мажліва, што напісаны твор іншаю асобай, якая засвоіла й цудоўна перапрацавала творчыя знаходкі Рамана.

Але ўжо надыходзіла іншая эпоха - час панаваньня новага гімнаграфічнага стылю званага канонам, закладальнікам якога стаўся сьв. Сапрон (†638г.) патрыярх Ерусалімскі. У творчасьці ж сьв. Андрэя Крыцкага (660-740гг.), аўтара дзівоснага Вялікага Канону, гэгы стыль дасягнуў сваёй вышыні. Зь цягам часу склалася традыцыя, паводле якой акафісты зьмяшчаліся ў сярэдзіне аднайменных канонаў пасьля шостай песьні(ірмасу). Спачатку акафіст, як гімнаграфічны жанар, разьвіваўся ў межах бізантыцкае культуры з захаваньнем нормаў, закладзеных першым творам. Крыніцамі для напісаньня станавіліся ня толькі Стары й Новы Запаветы ці псальмы, але й апакрыфічныя творы. З пашырэньнем культуры акафісту паўстала неабходнасьць у перакладах на іншыя мовы. Пры выкананьні перакладу перавага аддавалася сэнсу, як з кананічнымі тэкстамі, таму гранаверш і рыфмаваньне хайрэтызмаў былі страчаныя, што відаць у лацінскім і славянскім перакладах Акафісту. Пачала вагацца колькасьць хайрэтызмаў нават у межах аднаго твору. Даволі часта зьнікаў трынаццаты кандак. Характэрны для хайрэтызмаў вокліч: «Радуйся» зьмяняўся на іншыя звароты: «Ісусе», «Госпадзе», «Слава» і г. д.

«Малая падарожная кніжка» Ф. Скарыны зьмяшчае восем акафістаў. Уклад выкананы паводле бізан-тыцкага ладу штодзённых малітваў (гл. «Малітвы на ўвесь тыдзень» Кірылы Тураўскага), пры якім нядзеля прысьвячаецца Ўваскрошаньню Хрыстову; панядзелак - Анёлам; аўторак - Яну Папярэдніку; серада - Багародзіцы; чацьвер - апосталам і сьв. Міколу біскупу

Міраў Лікійскіх, якога вернікі Ўсходняе Царквы лічаць роўным апосталам; пятніца - пакутам і крыжовай сьмерці Госпада нашага Ісуса Хрыста; субота - усім сьвятым. Скарына з замілаваньнем ставіўся да традыцыяў, на карысьць чаго сьведчыць ня толькі лад укладаньня акафістаў, але й падыход да іхняга перакладу й апрацоўкі. У адносінах да структуры мэтад ягоны можна характарызаваць, як рэстаўрацыйны. Дзеля дасягненьня пасьлядоўнага папарнага рыфмаваньня хайрэтызмаў Скарына зьмяняў адны словы на блізказначнікі, другія нерастаўляў у межах хайрэтызму, зьмяняў лад хайрэтызмаў. Падобна на тое, што наш першадрукар быў знаёмы ня толькі з грэцкім тэкстам Акафісту але й зь іншаю гімнаграфічнай паэзіяй V-VII стст., у прыватнасьці Рамана Міласьпеўца. На карысьць гэтага сьведчыць наяўнасьць гранавершаў падобных да Раманавых у акафістах, створаных самім Скарынам, хаця гэта можна патлумачыць й паўднёва-славянскімі ўплывамі, знаёмствам з творчасьцяй Пахома Лагапета і Рыгора Цамблака, які ў 1415-1420гг. быў мітрапалітам Кіеўскім. Перапісвальнікам жа пазьнейшага часу гранаверш невядомы, у гэтым можна ўпэўніцца, паглядзеўшы на яго разбурэньне ў выніку пазьнейшых перапісваньняў з праўкай тэксту. У пасьляакафіставых малітвах Скарына выкарыстоўвае гомэатэлеўты, як тое рабілі Прокал Канстантынопальскі (Vст.) і Раман Міласьпевец. Пры разглядзе акафісты, зьмешчаныя ў «Малой надарожнай кніжцы» можна ўмоўна падзяліць на чатыры групы. Першая будоваю цалкам супадае з кананічнаю, гэта ўласна Акафіст да Багародзіцы. Другая: у будове маюцца адхіленьні: у кандаку першым замест рэфрэну зьмешчаны вокліч «Алілуя». Іхнія адпаведнікі былі вядомыя раней. Гэта акафісты да сьв. Міколы й Арханёла Міхайлы. Трэцьцяя: ня маюць трынаццатага кандака і іхнія адпаведнікі ня знойдзены. Гэта акафісты да магілы й крыжа. Чацьвертая: ня маюць трынаццатага кандака й рэфрэну ў кандаку першым. Гэта акафісты да Пётры й Паўлы, Яна

Хрысьціцеля, імя Ісусава.

Зьмешчаны Скарынам пераклад Акафісту да Багародзіцы амаль цалкам адпавядае кананічнаму Пераклад, а менавіта гэта рабіў Скарына, бо пісаў пасьля канону да Багародзіцы: «... перакладзены з грэцкае мовы на рускую...», ён разумеў як выверку і праўку тэксту. У скарынавым варыянце ёсьць адхіленьні, якія могуць дапамагчы знайсьці той рукапіс, што паслужыў укладальніку. Вызначальнымі ёсьць: згадка ў кандаку шостым пра прароцтва Балямава й ужываньне ў кандаку дзесятым слова «авечка» замест «чалавек». Параўнаць скарынаў варыянт з кананічным можна па выданьні а. А. Надсона «Акафіст найсьвяцейшай Багародзіцы», Лёндан, 1992. Але ня выключана, што Скарына меў перад вачыма рукапіс славянскага перакладу Акафісту й канону, бо скарынаў пераклад канону супадае з кананічным, а ў тэксьце Акафісту ёсьць памылкі, якія маглі зьявіцца ў выпадку карыстаньня ня якасным славянскім рукапісам: «света» замест «совета»(ікас 2), «пленице» - «плетения» (ікас 9), «псальмы» - «песка» (кандак 11). Праўда гэтыя памылкі маглі зьявіцца й пры наборы. Галоўная ж адметнасьць скарынавага варыянту рыфмаваньне хайрэтызмаў.

Другім акафістам, які добра супадае з кананічным варыянтам ёсьць акафіст да сьв. Міколы. У некаторых крыніцах гэты акафіст прыпісваецца кіеўскаму мітрапаліту Ахрэму II (1090-1096) і прысьвечаны перанясень-ню мошчаў сьвятога да Бары(Італія) ў 1087г. Параўнаньні паказалі, што адрозьненьні паміж варыянтамі большыя чым у выпадку Акафісту (карэляцыя недзе 80% пры 95% для Акафісту). Гэта дае падставу для думкі, што і ў дадзеным выпадку маем таксама справу зь перакладам. Тады аўтарства Ахрэма II сумнеўна.

Акафіст да Арханёла Міхайлы, зьмешчаны ў кніжцы Скарыны, будовай амаль ня розьніцца з кананічным. Пры параўнаньні выяўлена, што кандакі й першыя часткі ікасаў

добра супадаюць з кананічным варыянтам (карэляцыя недзе 60-70%), хайрэтызмы ж цалкам не падобныя. Хайрэтызмы кананічнага акафісту вызна-чаюцца большай шматслоўнасьцяй і меншай колькасьцяй іх у ікасе(7).

Казаць нешта пэўнае пра акафісты да Магілы Господняй і жыцьцядайнага Крыжа Господняга немагчыма з-за нястачы матар'ялу. Абодва акафісты ў адрозьненьні ад традыцыйнай будовы ня маюць трынаццатага кандака. Акафіст да магілы мае акрамя таго ў складзе ікасаў толькі 6 хайрэтызмаў. Параўнальны аналіз не выявіў агульнага паміж скарынаўскім акафістам да Крыжа Господняга й традыцыйным. Калі традыцыйны акафіст грунтуецца на Сьвятым Пісьме, дык крыніцамі для скарынаўскага сталіся ня толькі Стары й Новы Запаветы, але й паданьне пра знойдзеньне крыжа сьв. Аленай і зьяўленьне яго імпэратару Канстантыну.

Акафіст да Петры й Паўлы з гранавершам вядомы з XVст. і прыпісваецца канстантынопальскаму патрыярху Ісыдару (1347-1349гг.). Наяўнасьць ў славянскім тэксьце альфабэтнага гранаверша заслуга невядомага перакладчыка, які зьмясьціў гранаверш паводле кірылічнага альфабэту, адкінуўшы літары, што стаяць у ім пасьля амэгі. Пэўна ў Скарыны й маем той самы акафіст, бо вершы, што папярэднічаюць уласна акафісту, гранавершам не ахопленыя.

Аўтарства акафіста да Яна Папярэдніка прыпісваюць таму ж канстантынопальскаму патрыярху Ісыдару, але гэта тычыцца кананічнага твору. Акафіст жа, што зьмешчаны Скарынам, зусім не падобны да кананічнага. Ён мае значныя адхіленьні ў будове: адсутнасьць 13-га кандака, рэфрэна ў 1-м кандаку. Наяўнасьць гранавершу «ПИСАЛ ДОКТОР СКОРИНИЧ ФРАНЦИСКУС», якім ахоплены ня толькі сам акафісг але й папярэднія трапары й стыхіры, што звычайна чытаюцца перад канонам, дае падставы для думкі пра аўтарства самаго Скарыны.

З усіх акафістаў «Малой падарожнай кніжкі» найбольш нязвыклым ёсьць акафіст да імя Ісусава, які акрамя адхіленьняў у будове (адсутнасьць 13-га кандака й рэфрэну ў 1-**м** кандаку) вылучаецца тым, што ня мае скразнога рэфрэну. Ягонае месца займае трынаццаты хайрэтызам, уласьцівы толькі канкрэтнаму ікасу. Але апошнія хайрэтызмы ікасаў падобныя адзін да аднаго. У выніку сувязь структуровых частак твору замест трывалага зьнітаваньня набывае форму гнуткае повязі. Акафіст да Госпада Ісуса, што вядомы перапісвальнікам з XVст., паслужыў Скарыну зыходным матар'ялам. Параўнальны аналіз выявіў, што кандакі й уводныя часткі ікасаў скарынаўскага й кананічнага акафістаў зусім розныя, але хайрэтызмы маюць шмат агульнага. Супадзеньні ў тэкстах хайрэтызмаў вагаюцца ад 40% у ікасе 12 да 80-90% у ікасах 4 і 6. Такім чынам ствараючы новы акафіст Скарына пазычыў агулам блізу 60% хайрэтызмаў з старога акафісту, апрацаваўшы й паставіўшы іх на новыя месцы. Упэўняе нас у тым, што гэта твор скарынаў і гранаверш «ДЕЛАЛ ДОКТОР СКОРИНИЧ ФРАНЦИСКУС», якім ахоплены ня толькі сам акафіст але й папярэднія вершы.

Параўнаньне вершаў, зьмешчаных перад Акафістам да Багародзіцы ў «Малой падарожнай кніжцы» з кананічнымі з службы Багародзіцы дае падставы сцьвярджаць, што яны не зьяўляюцца творамі Скарыны. ВЕРШы 1-3 ёсьць стыхірамі на «Госпадзе клічу... » (тон 6); СЛАВА - СЛАВА, І ЦЯПЕР на «Госпадзе клічу... » (тон 2); І ЦЯПЕР - СЛАВА, І ЦЯПЕР стыхіраў на стыхоўні (тон 2). У акафісьце да Пеётры й Паўлы ВЕРШ 1 падобны да трапара сьвятым (тон 2) на сьвята 29 чэрвеня. Верш І ЦЯПЕР у акафісьце да сьв. Міколы ёсьць трапаром (тон 2) з службы да сьвятога. Верш пад тытулам СЛАВА ў акафісьце да Крыжа Гасподняга мае такі самы тытул і зьмест, што й у каноне да Сьвятога Крыжа (песьня 1, тон 4) Рыгора Сынайца, а ВЕРШЫ 2 і 3 падобныя да ЗАПЕВУ з таго самага твору. Вершы ВЕРШ 1-3, СЛАВА у акафісьце да імя

Ісусава вельмі падобныя да стыхіраў на «Хваліце...» (тон 4) з кананічнага акафісту да Госпада нашага Ісуса Хрыста. Не зважаючы на тое, што гэтыя вершы ахопленыя разам з усім акафістам адным скарынаўскім гранавершам, мусім прыняць да ўвагі згадку ў зьмесьце «Малой падарожнае кніжкі», што гэтыя стыхіры Госпаду Ісусу ёсьць творамі манаха Студыцкага манастыру Тэактыста(IXст.). Як відаць з вышэй напісанага ўносак самога Скарыны ў айчыннуто гімнаграфічную спадчыну вымагае далейшых пошукаў.

Сымон Полацкі ў справе гарманізацыі Акафісту пайшоў шмат далей за Скарыну. Скарына рабіў толькі аздабленьне твору хаця й добра ведаў сылабіку, аб чым сьведчыць уступ да кнігі Ёва:

Богу въ Троици единому ко чти и ко славе
Матери Его Пречистой Марии к похвале
Всем небесным силам и святым Его к веселію
Людем посполитым к доброму научению.

Сымон Полацкі ж увесь Акафіст выклаў адзінаццацісkладовым сылабічным вершам, тым самым разбурыўшы былую структуру й стварыўшы новую. Захаванымі засталіся падзел на кандакі й ікасы, наяўнасьць рэфрэну ў ікасах і першым кандаку, але нутраная будова зьмененая. Кандакі й ікасы ўжо структурова ня розьняцца, хайрэтызмы ў межах ікасу не выдзяляюцца, а зьяўляюцца звычайнымі двухрадкоўямі. Памер хайрэтызму тут не абмяжоўваецца адным радком. Бывае, што ён пашыраны на ўсе двухрадкоўе, ці пачынаецца зь сярэдзіны аднаго радка й сканчаецца на сярэдзіне другога. Стылёвыя зьмены вымагалі зьмены зьместу, таму зразумела, што акафіст да Найсьвятой Дзевы розьніцца з Акафістам і сэнсам. Параўнаньне пераконвае ў тым, што для твора Сымона Полацкага крыніцаю стаўся кананічны пераклад Акафісту (адсутнасьць згадкі пра Баляма й пасьлядоўнасьць хайрэтызмаў). Напісаны акафіст да Найсьвятой Дзевы, як вынікае з

тэксту, у 1648г. калі Сымон Полацкі навучаўся ў кіеўскай Магілянскай калегіі. Пазьней недзе ў 1651г. ён ад'ехаў да Вільні.

Тое, што напісана вышэй пра падыход Сымона Полацкага ў справе рыфмаваньня акафісту да Найсьвятой Дзевы, ёсьць справядлівым пры разглядзе акафісту да Госпада нашага Ісуса Хрыста. Час напісаньня твору недзе 1648-5Ігг., бо стылёва абодва акафісты вельмі падобныя. Узорам для яго паслужыў хутчэй за ўсе акафіст кананічны, на карысьць чаго сьведчыць урывак пра дзяўчыну хананэйскую ў кандаку першым. Удакладніць крыніцу для акафістаў С. Полоцкага пэўна дапаможа зьмест пасьляакафіставых малітваў. Цяжка адказаць зь якою мэтай пісаў вучань Магілянскае калегіі гэтыя творы. Пераклад на польскую мову пэўна абумоўлены значнаю палянізацыяй грамадзкага жыцьця ўсходніх земляў тагачаснае Рэчы Паспалітае. Славянская мова была ўжо незразумелая, а беларуская, як дзяржаўная, паступова свае пазыцыі траціла. У гэткіх варунках адукаваная частка грамадзтва, без увагі на канфэсыйную прыналежнасьць, арыентавалася на мову польскую. Яшчэ раней з гэтае ж прычыны ў 1635г. праваслаўны мітрапаліт Кіеўскі Сыльвэстар Косаў пераклаў і выдаў у польскай мове «Пацярык пячэрскі». Ніжэй дзеля параўнаньня падыходаў Ф. Скарыны й С. Полацкага да апрацоўкі Акафісту зьмешчаныя пераклады пятага ікасу.

Кананічны:

Видеша отроцы халдейстіи, на руку Девичу создавшаго руками человеки, и Владыку разумевающе Его, аще и рабій приял зрак, потщашася дарми послужити Ему и возопити Благословенней:

Радуйся, звезды незаходимыя Мати
Радуйся, заре таинственнаго дне
Радуйся, Троицы таинники просвещающая
Радуйся, мучителя бесчеловечнаго изметающая от начальства

Радуйся, Господа человеколюбца показавшая Христа
Радуйся, варварскаго избавляющая служенія
Радуйся, тименія изимающая делъ
Радуйся, огня поклоненіе оугасившая
Радуйся, пламене страстей изменяющая
Радуйся, верныхъ наставнице целомудрія
Радуйся, всехъ родовъ веселие
Радуйся, Невесто неневестная

Францішка Скарыны:

Видеша отроци халдейстиі, на руку Девичю создавшего рукама человеки, и Владыку разумевающе Его быти, аще и рабиі приат зракъ, подщашеся дарми угодити Ему, и возопиша Благословенной:

Радуйся, Мати звезды незаходимое
Радуйся, свете зори утренее
Радуйся, прельсти пещъ оугасивши
Радуйся, о Троици человеки просветивши
Радуйся, врага немилостива от власти изметающи
Радуйся, Господа человеколюбца Христа показующи
Радуіся, иже отводиши от служебъ поганских
Радуйся, иже избавляеши от делъ скверных
Радуйся, огню поклонение оуставльши
Радуйся, пламени страшного силу изменивши
Радуіся, верным наставнице и целомудрие
Радуйся, всехъ народов веселие
Радуіся, Невесто неневестная

Сымона Полацкага:

Gdy obaczyli chaldeyscy krolowie
Na reka Panny prawdziwi wießczkowie
Tworce czlowieka, Panem Go uznali
Lub niewolnikie stal, ofiarowali
Dary Mu godne z uslugami swemi

Spiewaiac wdziecznie glosy rozlicznemi
Badz pozdrowiona, gwiazdy nieschodzacey
Matko, swiatloscia swiat oswiecaiacey
Badz pozdrowiona, jutßenko ognista
Dnia taiemnego, Dziewico Pßeczysta
Badz pozdrowiona, piec ugaßaiaca
Klamstwa a skrytosc Troycy ziawiaiaca
Badz pozdrowiona, zes kaceßa zlego
Wygnala Panno z dziedzictwa twoiego
Badz pozdrowiona, czlekolubiwego
Rodzaca Panno Syna iedynego
Badz pozdrowiona, niewole poganskiey
Nas zbawiaiaca pßez moc reki Panskiey
Z sprosnych uczynkow wßytkich oczyscilas
Poklon ogniowi Panno ugasilas
Badz pozdrowiona, plomienie gaßaca
Affectow ciala y zadze nißczaca
Badz pozdrowiona, mistßynio czystosci
Wierny narodom pßyiemna radosci
Badz pozdrowiona, Matko pßy panienstwie
Panna zrodzilas Boga w czlowieczenstwie

МАРАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫ АСПЕКТ ПЕДАГАПЧНАИ СПАДЧЫНЫ СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА

Болбас В. С.,
(г. Мазыр)

Выключная ўвага Сімяона Полацкага да праблемы маральна-духоўнага ўдасканалення грамадства ў значнай ступені бьша абумоўлена пастаяннай скіраванасцю да маральна-этычных праблем грамадскай і педагагічнай думкі ўсходніх славян, адпаведным напаўненнем зместу хрысціянскага веравучэння і ўплывам на мысліцеля рэнесансавых ідэй эпохі Адраджэння.

Пастаянна абапіраючыся на дасягненні ўсходнеславянскай педагагічнай культуры, творча выкарыстоўваючы распрацоўкі заходнееўрапейскіх гуманістаў, праяўляючы клопат аб шырокім, выходзячым за рамкі афіцыйнай артадаксіі, разуменні хрысціянскай этыкі, Сімяон Полацкі ўнёс значны ўклад у распрацоўку айчынных тэарэтычных асноў маральнага выхавання. У процівагу сярэднявяковым уяўленням аб сапсаванасці чалавечай прыроды, схільнасці яе да зла, філасаф-педагог першым з еўрапейскіх мысліцеляў аднаўляе антычную ідэю Арыстоцеля аб адсутнасці ў чалавека прыроджаных ідэй. Уяўленне аб душы чалавека як аб «чыстай дошцы» (tabula rasa) вызначае капцэптуальны падыход да выхавання як усемагутнай пераўтвараючай сіле, якая здольна істотным чынам удасканаліць кожную асобу і грамадства наогул. Па гэтай прычыне Сімяон Полацкі яўна пераацэньваў магчымасці выхавання, але на той час гэта было прагрэсіўнай з'явай у абгрунтаванні неабходнасці спецыяльнай арганізацыі асветна-выхаваўчых працэсаў.

Асновай эфектыўнасці выхаваўчых намаганняў айчынны педагог лічыў чалавечы розум, а дакладней яго развіццё і ўдасканаленне. Фарміраванне дабрачыннай асобы, на яго думку, немагчыма без разумовага развіцця. Таму ў многіх сваіх трактатах Сімяон дае канкрэтныя парады, якім чынам і з дапамогай якіх метадаў і сродкаў магчыма ўдасканаленне розуму, а праз яго і фарміраванне маральнасці. Магістральным шляхам такога працэсу ён лічыць узбагачэнне розуму ведамі, набыццё мудрасці, адукаванасці. У шырокай асвеце народных мае ён бачыў шлях іх маральна-духоўнага аздараўлення. Прычым кнізе і кніжным ведам адводзіцца першаступеннае месца.

Паставіўшы ў якасці ўтвараючага пачатку сваёй выхаваўчай сістэмы чалавечы розум, Сімяон вялікую ўвагу надае спецыяльна арганізаванаму навучанню. У сваіх дыдактычных распрацоўках ён арыентуе на актыўнае, асэнсаванае набыццё ведаў. Сур'ёзную ўвагу звяртае на ўзроставыя асаблівасці і псіхалагічныя адметнасці дзяцей. Важна, што маральнае развіццё педагог не ставіць у поўную залежнасць ад навучання і значную ўвагу надае ўласна маральна-выхаваўчаму ўздзеянню: прыклад бацькоў і настаўнікаў, шматлікія сродкі метадаў пераканання, прывучэння, заахвочвання, пакарання і інш.

Вялікую ролю ў маральным выхаванні ён адводзіць *наст*аўніку, а яшчэ большую сям'і. У распрацоўцы пытанняў сямейнага выхавання у айчыннай грамадскай і педагагічнай думцы Сімяона Полацкага з упэўненасцю можна назваць адным з пачынальнікаў. Прычым ён першы сярод усходнеславянскіх педагогаў узняў пытанні аб выхаванні дзяўчынак і аб ролі маці ў сямейным выхаванні.

Аналіз педагагічнай спадчыны Сімяона Полацкага дае падставы сцвярджаць, што ў адрозненне ад многіх іншых еўрапейскіх мысліцеляў-педагогаў, адны з якіх у выхаванні аддавалі прыярытэт школе, іншыя сям'і, ён сцвярджаў, што клопат аб выхаванні дзяцей павінен быць усеагульным клопатам і

сям'і, і школы, і грамадства, і дзяржавы.

У адрозненне ад ідэй асновапаложнікаў рэнесансавага руху - гуманістаў Італіі, якія стрыжнем гарманічнага фарміравання асобы лічылі маральна-духоўнае развіццё, але раўнапраўнымі кампанентамі пры гэтым выступалі разумовае і фізічнае ўдасканаленне, Сімяон Полацкі яўна заніжаў ролю апошняга. Тым не меньш, у параўнанні з прадстаўнікамі паўночнага Адраджэння, якія наогул ігнаравалі клопат аб целе, ён заяўляў, што цвярозасць розуму непасрэдна залежыць і ад фізічнага здароўя індывіда. Прытрымліваючыся падыходаў больш ранняй арганізацыі выхавання дзяцей, Сімяон пры вызначэнні такога ўзросту ў катэгарычнай форме выказаў слушную ідэю аб неабходнасці выхавання дзяцей з моманту іх нараджэння.

Прынцыпова адрозніваюць Сімяона Полацкага ад дзеячаў гуманістычнай педагогікі падыходы ў вызначэнні характару адносін выхавацелей да выхаванцаў. У той час калі еўрапейскія гуманісты рашуча асуджалі грубасць, жорсткасць настаўнікаў, і толькі асобныя ў якасці выключэння дапускалі падчас за пэўныя ўчынкі фізічныя пакаранні, Сімяон, аддаючы даніну ўсталяваўшайся традыцыі, заклікае «не щадити жезла» у выхаванні дзяцей.

Адным з тлумачэнняў падобнай пазіцыі педагога з'яўляецца тое, што іншыя погляды проста не былі б успрыяты ў існаваўшай рэчаіснасці і асветна-выхаваўчая місія слыннага педагога, якой ён цалкам і поўнасцю прысвяціў свае жыццё, проста была б немагчымай. У гэтым напрамку слушнымі з'яўляюцца папярэджанні Сімяона аб недапушчэнні перарастання любві і клопатаў бацькоў да дзяцей у «празмерную любоў», якая вядзе да ўседазволеннасці, патакання капрызам і, у рэшце рэшт, прыводзіць да адмоўных выхаваўчых вынікаў.

Прытрымліваючыся прынцыпу прыродаўзгодненнасці выхавання Сімяон Полацкі адказы на многія пытанні грамад-

скага ўладкавання і арганізацыі выхаваўчых працэсаў шукаў у агульных законах прыроды. Ён пастаянна падкрэсліваў, што сумеснае суіснаванне, абшчыннасць, узаемная дапамога ёсць пераважаючы факт прыроды, яе агульнае правіла. На думку мысліцеля, менавіта, грамадскі інстынкт з'яўляецца крыніцай, якая сілкуе ўсе маральныя пачаткі і надае дынамізм далейшаму развіццю маральнасці. Неаднаразова Сімяон Полацкі падкрэслівае, што першым настаўнікам маральнасці з'яўляецца сама прырода, якая вучыць асабістае Я замяняць на грамадскае МЫ. Паняцце аб дабры і зле выпрацоўваюцца, такім чынам, не на аснове таго, што ўяўляе сабой дабро ці зло для асобнага чалавека, а на тым, што яны ўяўляюць сабой для пэўнай людской супольнасці. У сваю чаргу маральна-духоўны ўзровень канкрэтнага чалавека вымяраецца перш за ўсё карыснасцю, грамадскай значнасцю яго дзеянняў і ўчынкаў. Добрыя справы, а не пачуцці і намеры павінны вызначаць сапраўднага чалавека. Тут яўна прасочваецца сімбіёз элементаў язычніцкай і хрысціянскай этыкі ў поглядах мысліцеля, што было характэрным для старажытнарускай філасофскай думкі.

Такім чынам, аналізуючы адпаведныя погляды выдатнага айчыннага мысліцеля, можна прыйсці да высновы, што ім зроблены істотны ўклад у развіццё сусветнай этыка-педагагічнай думкі, закладзены трывалыя цагліны ў падмурак фарміравання тэарэтыічных асноў маральнага выхавання на ўсходнеславянскіх землях. Многія ідэі педагога шмат гадоў былі сапраўдным арыенцірам для арганізатараў працэсу маральна-духоўнага удасканалення грамадства. Не страцілі сваёй каштоўнасці яны і ў наш час.

НЯБЕСНЫЯ НАВУКІ І ЗЯМНЫЯ ШЛЯХІ СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА.

Віцязь С. П.,
(г. Мінск)

Сімяон Полацкі, ураджэнец беларускага горада Полацка, прызнаны дзеяч культуры часоў сярэднявечча, загадкавая і натхняючая асоба, вывучэнне якой яшчэ далека не дасягнула апошняй мяжы.

У дадзеным паведамленні разглядаецца падыход да асэнсавання дзейнасці Сімяона Полацкага з пункту гледжання яго сацыяльнага ўплыву. Вылучаюцца мэты і сродкі гэтага ўплыву, іх палітычны характар. Прапануецца новая канцэпцыя асэнсавання яго біяграфіі.

Агульнавядомыя вызначэнні творчага шляху Сімяона Полацкага: паэт, педагог, асветнік, прапаведнік, багаслоў, інш. - заклікаюць да пэўных удакладпенняў. Прывядзем яго абгрунтаваныя характарыстыкі: Сімяон Полацкі «не принадлежит к числу великих писателей, но... положил основание в русской литературе в той отрасли которая до него почти совсем не была разработана - поэзии и драматургии» [1, с. 260]; - «не ставил перед собой задачу научить чему-то принципиально новому. Он стремился обобщить всё, что было зафиксировано в книжной мудрости, и этому исчерпывающему знанию научить максимально широкую аудиторию» [2, с. 218]; - «был среди тех, кто ещё в XVII в. стремился не допустить разрыва между церковью и культурой, пересказывая в виршах все новинки современной ему науки и популяризируя предания разных эпох» [2, с. 211]. Да гэтага варта далучыць і няпростае стаўленне да асобы Сімяона Полацкага з боку царкоўных уладаў, якія спачатку даручылі яму на Саборы 1666 г. пад-

рыхтаваць ідэалагічную працу («Жезл правления») супраць раскольнікаў, ва ў аб'яднанне праваслаўнай царквы, а праз 10 год пасля яго адыходу з жыцця, на Саборы 1690 г. - забаранілі яго творы, як ерэтычныя.

Для аб'ектыўнага ўспрыняцця дзейнасці Сімяона Полацкага дарэчы будзе ўзгадаць галоўныя своеасаблівасці папярэдняй эпохі: адыход першапачатковых каралеўскіх радоў Ягеллонаў (Гедзімінавічаў) у Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) (1572 г.) і Рурыкавічаў у Расіі (1598 г.), ды ўвядзенне праваслаўнага патрыярхата ў Расіі (1589 г.) і каталіцка-праваслаўнай уніі ў Рэчы Паспалітай (1596 г.). Тыя падзеі ў вялікай ступені вызначылі змест эпохі, сучаснай дзейнасці Сімяона Полацкага, калі высвятліўся грубы палітычны ціск у духоўных абшарах грамадскага жыцця, які прывёў неўзабаве да канфесійнага, а ў хуткім часе - і да этнічнага супрацьстаяння, і далей, да непрадбачанага выніку - да аб'яднання Малай і Вялікай Русі (1653-54 гг.). Вынік гэты ініцыіраваўся стыхійнымі рухамі вернікаў, і быў рэалізаваны праз вайсковыя дзеянні і палітычныя пагадненні. Падобнае адбывалася і на беларускіх землях.

На гэтым фоне стан Сімяона Полацкага выклікае пачуццё недасказанасці. Ці не супярэчыць яго актыўная мастацкая дзейнасць заклікам да «аб'яднання зямель Белай і Вялікай Русі»? (У своеасаблівай, дарэчы, форме): Всадник меченосный (1) с копейным (2) случися, Орлу светозарному (3) служите потщися. [3, с. 37] (Дзе 1 - герб ВКЛ, 2 - герб Масквы, 3 - герб Расіі).

Ці не мае рысы інфаптыльнасці такая жыццёвая пазіцыя - пакінуць радзіму, каб складваць вершы пры чужым двары? Ці не вялікая гэта цана, каб «неплохо устроиться» і «стать первым профессиональным писателем в Московском государстве» [4, с. 106]? На гэтыя запыты вышукваецца адказ у прапануемым даследванні.

Нават кароткі агляд дзейнасці Сімяона Полацкага адкрывае шматлікія рысы надзвычайнасці. Напрыклад, яго вучоба - у найлепшым на той час праваслаўным цэнтры багаслоўскай і гуманітарнай адукацыі - Кіева-Магілянскай калегіі. Яго ўзаемаадносіны - з найвышэйшымі асобамі таго часу - царом Вялікай Русі і царскім асяроддзем, Сусветнымі і Расійскімі патрыярхамі праваслаўнай царквы. Звесткі і метады, якімі ён валодаў - навейшыя і выніковыя [5]. Яго плён - гэта ўражваючая нават на сёняшні час колькасць асабістых твораў, у тым ліку друкаваных; гэта - уведзеная ім друкарня (т. зв. «Верхняя», 1678 г.) - грунтоўна абсталяваная, з мастакамі, лепшымі на той час (С. Ушакоў, А. Трухменскі) [1, с. 230]; гэта - праект стварэння Маскоўскай акадэміі (1680 г.), што ў далейшым перасягнула калегію, дзе ён вучыўся, і г. д.. Відавочна, такі чалавек - чалавек справы. Ці магла такая высокаадукаваная і дзейная асоба не імкнуцца да нечага надзвычайнага? У чым жа была звышзадача Сімяона Полацкага?

Падстава для яе разумення, як бачыцца, трапна вылучана ў даследванні [2, с. 212]: Сімяон Полацкі «испытал на себе серьезное влияние... идей святого апостола Павла. Он часто ссылается в своих виршах и проповедях на апостола Павла, цитирует его послания». Так, гэта фіксуецца, як па форме, так і па зместу («Жезл правления», «Венец веры кафолическия», «Елогион» («Орел Российский»), «Труд», «Начальник» («Вертоград... »), «Предисловие», «Желание творца» («Рифмологион»), інш.). Апостал Павел - найвялікшы з апосталаў, паколькі ў адрозненне ад іншых, быў сучаснікам, але не меў шчасця асабіста бачыць Хрыста. Між тым, зрабіў больш за іншых, паколькі Слова Боскае ўпарта праводзіў да Справы. Напэўна, Сімяону былі вядомыя словы Св. Паўла:

Подражайте мне, как я Христу. (1 Кор., IV, 16, інш.). Ибо всем нам должно явиться пред судилище Христово, чтобы каждому получить соответственно тому, что он делал, живя в

теле, доброе или худое. (2 Кор., V, 10).

Ибо я наименьший из Апостолов... но более всех их потрудился; не я впрочем, а благодать Божия, которая со мною. (1 Кор, XV, 9-10)

Для чалавека ж, абраўшага лёс святара, праз усе 14 Пасланняў Св. Паўла праходзіць заклік - усемагчыма садзейнічаць пашырэнню Царквы, якая ёсць «цела Збавіцеля Свету Ісуса Хрыста». З усіх магчымых шляхоў у гэтым высакародным накірунку Сімяон Полацкі, як бачыцца, узяўся рэалізаваць адзін з самых надзвычайных. Як рэаліст, ён звярнуўся за згодай да найбольш уплывовай асобы ў дзяржаве - да яе кіраўніка! Вядома, што ў тыя часы да маскоўскага цара, як увасабленне праваслаўнай улады ў свеце, за падтрымкай ішлі амаль бесперапынным патокам пасланнікі з зямель Белай і Малай Русі. Але, у большасці, кожны з іх запытваў пра асабістую праблему, Сімяон жа звярнуўся з заклікам усеагульным, дзяржаўнага ўзроўню, які настойліва вылучаецца скрозь усе яго творы - умацаванне, пашырэнне праваслаўнай царквы ў свеце, праз узаемадзеянне з царскай уладай. На такі ж шлях заклікаў і Св. Павел:

Итак, прежде всего прошу совершать молитвы, прошения, моления, благодарения за всех человеков. За царей и за всех начальствующих, дабы проводить нам жизнь тихую и безмятежную, во всяком благочестии и чистоте. Ибо это хорошо и угодно Спасителю, нашему Богу. (1 Тим., II, 1-3).

(Відаць, невыпадкова цар Аляксей Міхайлавіч атрымаў менавіта найменне «тишайший»). Па творах Сімяона Полацкага відавочна яго стаўленне да манархіі, асвечанай Царквою, як да найлепшага дзяржаўнага строю - Боскай улады на Зямлі. Таксама, ён мудра падзяляў абшары дзейнасці ўлады свецкай і духоўнай, у пошуках плённай раўнавагі (якую няпроста збудаваць: так, патрыярх Нікан спрабаваў парушыць яе ў адзін бок («священство выше царства»), а цар Петр I пару-

шыў у другі (падпарадкаваўшы царкву дзяржаве). Такі шлях, шлях дыялогу з манархам, адзін з найвышэйшых сярод магчымых, абірае Сімяон для дасягнення сваёй глыбіннай мэты.

Адразу ўзнікае пытанне - чаму Сімяон Полацкі не звярнуўся да караля Рэчы Паспалітай? Вельмі верагодна, што аб бесперспектыўнасці такого зварота Сімяон даведаўся ад вядомага сваёй грамадскай дзейнасцю манаха Купяціцкага манастыра Афанасія Філіповіча. Менавіта пасля падобных зваротаў таго неаднаразова саджалі ў турму і двойчы (1643 і 1645-47 гг.) высылалі ў зняволенне ў Кіева-Пячорскі манастыр [6, с. 52, 81], дзе на той час (да 1650 г.) праходзіў свой 14-гадовы навучальны курс Сімяон Полацкі. [7, с. 208] Напэўна, такая сустрэча магла адбыцца, і неаднаразова. Таксама, Філіповіч мог паведаміць і пра свой плённы зварот да расійскага пара (1638 г.). Акрамя таго, узгадаем, погляды Сімяона на царскую асобу былі досыць кананічнымі: цар павінен быць адзіным у дзяржаве і асвечаным Богам (гэтыя ідэі цар Аляксей Міхайлавіч з цяга м часу добра засвоіў):

Всякая власть от Бога,
Он бо благи дает властелины. [8, с. 338].
Солнце едино весь мир озаряет,
Бог превыспрь небо един обладает:
Тако во царстве един и мать быти
Царь, вся ему же достоит правити. [8, с. 25]

З такога пункту - становішча ў Рэчы Паспалітай не адпавядала канонам Сімяона Полацкага: у постягелонскія часы (з 1572 г.) кароль абіраўся шляхтай, а меркаванні шляхты не заўсёды супадалі, і ніякім чынам не маглі параўнацца з Боскім абраннем. Акрамя таго, ні каталіцтва, ні ўніяцтва Сімяон, натуральна, не прымаў за сапраўднае вучэнне, якое правамоцна асвячаць каралеўскую асобу. Многае сцвярджалася і рэальнымі падзеямі: у 1587 г. польская шляхта сілаю зброі не дапусціла да прэстола караля Максіміліана Габсбурга, асвечана-

га кіеўскім мітрапалітам (вышэйшы праваслаўны стан у Рэчы Паспалітай), і падтрымала пры тым асобу Сігізмунда Вазы (зацверджанага каталіцкім прымасам), што да таго ж высвятліла супрацьстаянне рэлігійных плыняў у дзяржаве. Дарэчы, надобны сюжэт Сімяон Полацкі адлюстраваў у сатырычным вершы «Wzgarda godnosci y czci pragnienie» (напісаны папольску) аб тым, як дрэвы абіралі паміж сабою караля, але кіяк не маглі зацвердзіць годнага, і нарэшце стаміўшыся, абралі абыякавага.

Страх, боязнь, раны от злого тирана.
О Боге он забывает, о славе не радеет,
На Небо плюёт, ада не страшится...
Всех он погубит и сам погибнет,
Как искра город спалив угаснет. [8, с. 168]

- так заключае Сімяон гэты твор. Бясспрэчна, не мог ён ухваліць і псеўда-манархічныя гульні Рэчы Паспалітай з Расіяй на працягу 1604-1645 гг., калі тая рыхтавала на расійскі прастол тры ілжэ-Дзмітрыі запар! (Дарэчы, Сімяон, напэўна, мог атрымаць і звесткі пра апошняга «кандыдата» «з першых рук» - ад узгаданага вышэй манаха Афанасія Філіповіча, які волею лёсу пэўны тэрмін быў таму «кандыдату» настаўнікам).

Натуральна, што Сімяон Полацкі зрабіў выбар на карысць расійскага, праваслаўнага ўладара. Да гэтага магчыма дадаць наступнае. Як вядома, царская дынастыя Раманавых паходзіць ад прускага баярына (к. XIII ст.) Гланда Камбілы (пасля крышчэння - Андрэй Кабыла) [9], род якіх для беларусаў з'яўляецца не меньш роднасным, чым для рускіх [10]. Далей, для абгрунтавання пострурыкаўскай царскай дынасціі Раманавых у Расіі было праведзена спецыяльнае генеалагічнае даследванне. Адбылося яно ў недалёкім для Сімяона Полацкага мінулым (к. XVI ст.), і ён напэўна мог азнаёміцца з тым зместам. Магло мець вагу і тое, што літаральна праз месяц

пасля першай сустрэчы ў Полацку Сімяона з царом, у Вільні адбыліся руска-польскія перамовы аб аб'яднанні зямель Малай, Белай і Вялікай Русі, і абранні Аляксея Міхайлавіча каралём Рэчы Паспалітай. Таму, можна адзначыць, што для жыхара ВКЛ асоба рускага пара была не надта далёкай.

З першай сустрэчы ў 1656 г. са сваім равеснікам, царом рускім, Сімяон здолеў паказаць, што ён бачыць тое, чаго іншыя не заўважаюць. І, не меўшы аніякіх сродкаў уздзеяння, акрамя слова, праз 8 год ён здолеў авалодаць правам звяртацца непасрэдна да расійскага ўладара (што было далёка не проста. Вядома, напрыклад, што епіскап Луцкі ў 1624 г. не здолеў патрапіць на асабісты царскі прыём нават з афіцыйнай прапановай далучыць Малую Русь да Маскоўскай дзяржавы). Месца сваё Сімяон асэнсоўваў дакладна:

Великие ж престолы - неприятны, опасны,
Полны страха, забот и неустойчивы. [8, с. 168]
Царь, вся ему же достоит правити.
Обаче в помощ трудов нестерпимых,
Да имать совет муж благочестивых. [8, с. 26].

У мастацкай, на першы погляд, творчасці Сімяона Полацкага можна ўпэўнена прасачыць праявы накіроўваючага уздзеяння на царскую палітыку, што вылучаюцца праз 3 галоўныя плыні. Усе яны вартыя падрабязнага разбору, які плануецца правесці ў наступным даследванні. Зараз жа коратка ахарактэрызуем іх.

1 - стварэнне агульна-раўнаважнай, добрай, мудрай атмасферы ў царскім асяроддзі: свайго роду псіхалагічны маніторынг, тэарэтычнымі і практычнымі прынцыпамі якога Сімяон Полацкі дакладна валодаў [5, с. 17]. Выконвалася гэта менавіта праз мастацкае ўздзеянне, абавязкова праведзенае трапна і своечасова, праз стварэнне паэтычных алегорый, віншаванняў, прывітанняў. Паколькі:

От добрых бо помыслов делеса благая

производна бывают, от злых паки злыя. [11, с. 259].

Злыя мысли в начале тщися истребити,

Егда бо силу возмут, не леть победита. [11, с. 136].

(Невядома, колькіх бедаў пашанцавала пазбавіцца дзяржаве, дзякуючы таму, што цар меў добры настрой).

2 - стварэнне ідэальнага вобразу «найлепшай улады», яе мэтаў, прынцыпаў, сродкаў. Гэтаму накірунку прысвечана вялікая колькасць асобных твораў, практычна ва ўсіх зборніках («Орел Российский», «Во царстве... », «Мудрый», інш.). Сярод галоўных палажэнняў якога: Православную веру расширяти, род прославляти. [3, с. 155]

Мало есть правды царю мудру быта, а подчинённых мудрости лишити, Речки малыя реку разширяют, мудрии роби царя прославляют. [11, с. 248].

3 - асабістыя наказы ўладарам: як самому цару Аляксею Міхайлавічу («Метры»), так і царэвічам Аляксею («Орёл Российский»), Фёдару («Приветство»), Сімяону («Благоприветствование»), Пятру («Вирши на рождение»). Сімяон Полацкі падтрымливаў, натхняў, накіроўваў, абуджаў царскіх асоб на высокія справы. У гэтым ён адчуваў вялікую адказнасць - і за манархам, і за сабой: Непристойны... царь, которы не судит, епископ (священник), который не напутствует. [11, с. 241].

Вышэйшая мэта ўсіх царскіх нарадаў Сімяона Полацкага - «пашыраць свет праваслаўны», прычым, у паступовым, планамерным руху: спачатку - спыніўшы няверных («агаранаў», «бісурманаў», «скіфаў»), потым - закранаючы Польшу, Л. зу, Украіну, Лівонію, далей - праз вызваленне Візанціі, ісці І нават да хрышчэння дзікіх лясуноў (Сібір) і потым - ўсіх названых раней няверных:

Просветися веры светом мрачная ночь неверия Асиатическия страны. [3, с. 11].

І ў выніку - прапанавалася зрабіць краіну прывабнай для кожнага, хто шукае ўвасабленне закону Боскага на Зямлі.

Заклік да першага крока гэтай праграмы - спынення «агаранаў» (мусульманаў, туркаў), адпаведна, гучаў часцей за іншыя, як найбольш актуальны. І, вядома, ён быў рэалізаваны яшчэ пры жыцці Сімяона Полацкага.

Характэрна, што ў творах 3 плыні Сімяон Полацкі асабліва мэтанакіравана звяртаецца да незвычайнай абшары ведаў - астралогіі, адной з «Сямі свабодных навук» [8, с. 122]:

Астрология бег небес отмечает, по звездам будущее легко определяет.

Сімяон упэўнены, што справы зямныя бяруць пачатак на Небе, у Боскім асяроддзі. Па словах аўтарытэтнага для яго Апостала Паўла:

Есть тела небесные и тела земные,
Но иная слава небесных, иная земных.
Иная слава Солнца, иная Луны, иная Звезд,
И звезда от звезды разнится в славе своей. (1 Кор., IV, 40-41).

Сімяон, разумеючы адказнасць за будучы лёс, за атрыманы давер, звяртаўся да манарха, сцвярджаючы сваё валоданне тым надзвычайным разуменнем неба:

Оураноскопий (ад «планеты астролагаў» - Урана) или зритель неба
В твоём есть брезе. Емли како треба
Архиреи оураноскопствуют,
Божественная егда си оумствуют. [3, с. 63].
Знающе правду, а о ней молчати,
Есть злато в землю тщетно закопати. [4, с. 144].

Істотна, што святар папярэджваў аб тым, што вядзенне нябеснай, астралагічнай справы патрабуе высокай агульнай адукацыі: спачатку неабходна «пазнаць сябе»:

Незнаяй себе, ничего же знает, аще и звезды небесны считает. [4, с. 138].

Наогул, сёння невядомы дакладны пералік патрабаванняў, дазваляючых займацца астралогіяй, але з аднаго таго факта, што са шматлікіх выпускнікоў, напрыклад, Кіева-Маг-

ілянскага калегіўма, вучыўшых гэту навуку, захаваліся досыць сціплыя звесткі нават пра астралагічныя працы Сімяона Полацкага, магчыма зрабіць вывад аб існаванні пэўных абмежаванняў. Дарэчы, тое ж сцвярджае строгая, нават жорсткая пазіцыя праваслаўнай царквы. Нават па сціплых заўвагах Сімяона высвятляецца, што тут патрабуецца наяўнасць адукаванасці, чысціні, і, галоўнае - адказнасці перад Богам: з якой мэтая чалавек бярэцца за гэту справу.

У якасці тэматычнага ўдакладнення тут магчыма правесці сціслае параўнанне двух вялікіх астролагаў - Сімяона Полацкага і агульнавядомага М. Настрадамуса (XVI ст.). Спачатку, уводныя звесткі. Так, абодва былі лекарамі, але МН лячыў цела, а СП - душу:

Бог врач есть всеистинный. К нему притекайте... [8, с. 381].

Абодва страцілі сям'ю, але МН - падчас эпідэмі, а СП - стаўшыся манахам. Абодва вучыліся ў найвышэйшых установах свайго часу і краю, абодва блізка сутыкаліся з уладарамі зямнога свету, і жылі ў царскім асяродку. Нарэшце, абодва пакінулі важкія творы паэтычнага пісьменства. Далей - сутнасць. Настрадамус, маючы талент, карыстаўся астралагічнымі ведамі фактычна безмэтава, звяртаючы іх літаральна на кожнага сустрэчнага-папярэчнага. У выніку - ён пакінуў спадчыну, якая не нясе людзям радасці, але ва ўсе часы выклікала жах і чаканне нейкай навалы (і навала прыходзіла да тых, хто яе чакаў!). Астралагічныя ж творы Сімяона Полацкага накіраваны асабіста на тых, каму прызначалася іх здзяйсняць - менавіта, на членаў царскай сям'і. Для ўсіх астатніх - гэта паэтычныя творы, таму, што для рэалізацыі царскіх наказаў трэба валодаць царскімі ж рэсурсамі. Астатнім - магчыма памарыць, уявіўшы сябе царом... Што, дарэчы, абуджае ў чалавеку адказнасць і разуменне таго, што за ўсё трэба плаціць. І за высокую царскую пасаду трэба плаціць высокімі ж царскімі справамі.

Маскоўскія справы полацкі манах вёл трывала і старанна. Займаючы высокае палажэнне на царскім двары, ён выкарыстоўваў яго толькі дзеля дзяржаўнай справы. Ён, асабісты дарадца цара, не шукаў ні царкоўных, ні свецкіх пасад. Не шукаў ён і славы паэта: так, ні адзін са зваротаў да царскіх асоб не быў растыражыраваны, захоўваючыся ў рукапісах. Варта ўзгадаць і яго шчырую грамадскую прапаведніцкую дзейнасць, праз якую ён, валодая практыкай псіхааналізу [5, с. 17] быў здольны звяртацца асабіста да прысутнай паствы, і дарэчы высвятляць прыватны настрой простых жыхароў, каб у далейшым будаваць свае наказы на рэальным падмурку.

Сімяон Полацкі увасабляў сабой найскладанейшы тып манаха - манаха, што жыве ў свеце. Не ў келлі, абасоблена ад штодзённай суеты, зямных праблемаў і спакусаў, але ў самым іх цэнтры - і пры гэтым жыў па Нябесных законах, увасабляючы іх у сваіх справах. (У гэтым таксама бачыцца сугучнасць з жыццёвым шляхам апостала Паўла, які здзяйсняў сваю місію менавіта ў свецкім асяроддзі, у штодзённым супрацьстаянні). Відавочна, такі чалавек, высокаадукаваны, глыбока веруючы і сумленна адказны - меў права звярнуцца да надзвычайнай нябеснай навукі, якую вызначаў, як першую ў свеце:

Первая книга - мир сей, в ней же написася,
Что либо от всемогущего Господа создася.
Первый лист есть небо, на нём же светила,
Яко письмена, Божия крепость положила. [11, с. 257].

Менавіта тыя пісьмены браўся чытаць Сімяон Полацкі, і накіроўваць па іх царскую палітыку, а значыць, і палітыку усёй дзяржавы. Пры тым ён сведчыў, што знакі нябесныя толькі паказваюць верагодныя падзеі, а вось як спраўдзяцца яны - залежыць ужо ад самога чалавека, ад яго ўпартасці, чысціні і добрасумленнасці:

Звезды во человецах воли не вреждают,
Токмо страстми плоти нечто преклоняют,

Тем же на звезды вины несть леть возлагати,
Егда кто злое некое обыче деяти. [11, с. 263].
Зело днесь низу путь свой совершает,
Небесный Зодий в земных изменяет,
Да мы земнии к нему приближимся,
Небесну свету его приобщимся. [8, с. 267]

Дарэчы, адпаведна выхоўваў Сімяона адзін з вядучых выкладчыкаў Кіева-Магілянскага калегіума І. Гізель: «... Звезды не являются единственной причиной темперамента ... ибо в наибольшей степени влияют естественные способности родителей и местные условия ... и хотя темперамент предопределён ... человек может улучшить или испортить естественные склонности привычками, ибо он свободен...». [5, с. 63].

Так, узяушыся за надзвычайную справу, Сімяон Полацкі выкарыстоўваў, акрамя агульнапрынятых, і надзвычайныя, нябесныя навукі. І дасягненні тых часоў, як асабістых, так і дзяржаўных, сцвярджаюць эфектыўнасць яго намаганняў (падрабязны разбор гэтага таксама належыць асобнай працы). Вопытам сваёй дзейнасці Сімяон Полацкі быццам бы тлумачыў свайму апаненту, патрыярху Нікану: сапраўды, царква павінна ўздзейнічаць на цара. Але як? Не па загаду, не па пасадзе, а менавіта па святасці нябеснай, па той чысціні ў зямным свеце, што прымаецца Небам. На яго прыкладзе становіцца відавочным, што толькі адзначаны Боскай пячаццю чалавек атрымлівае права чытаць Нябесныя пісьмёны (г. зн. - займацца астралогіяй) і распавядаць пра іх, і тым болей - радзіць царам. Такім вылучаецца высокі канон святарскага наказу Сімяона Полацкага.

У выніку прапануецца новая канцэпцыя жыццёвага шляху Сімяона Полацкага: канцэпцыя яго грамадска-палітычнага, дзяржаўнага ўздзеяння, менавіта праз уплыў на царскую сям'ю. Таму, ад'езд Сімяона ў Маскву - гэта не «пабег з роднага горада, занятага польскімі вайскамі», але асэнсаваны

рух насустрач рускаму, праваслаўнаму цару, як наилепшаму, на яго погляд, увасабленню на Зямлі Нябеснай, Боскай улады. Паэтычная творчасць Сімяона - не «сродак зарабіць на жыц-це», але варштат, шлях да зямнога правядзення яго высокай духоўнай праграмы, сутнасць якой - узрастанне «цела Царк-вы», праваслаўнага Хрысціянскага свету, Нябеснага свету ў свеце Зямлі.

Такім чынам, Сімяона Полацкага варта разглядаць не толькі ва ўзгаданых вышэй іпастасях, але і як палітыка, дзяр-жаўнага дзеяча. Мудрая, паступовая, узважаная яго праграма, часткова рэалізаваная ў найскладанейшыя часы XVII ст., часы ўладавых і этнічных перабудоў, заслугоўвае таксама пільнай увагі, як плённы вопыт, удалая навацыя, комплексны падыход да справы. Кнігі яго твораў, асабліва пропаведзі, поўныя цяп-лыні і мудрасці, не страцілі з цягам часу сваёй прывабнасці, як не перастаюць прывабліваць нябесныя рухі. Яго ўменне вылучаць галоўнае, прымаць нсардынарныя рашэнні, выкары-стоўваць усе магчымыя сродкі, захоўваючы законнасць і чыс-ціню - вартыя асэнсавання і зараз. У сёняшні час, які ледзь не ў люстэрка нагадвае падзеі 300-гадовай даўніны, карысна буд-зе пашукаць аналогіі, цвяроза падумаць аб былых традыцыях і аб шляхах пабудовы здаровай, дзеяснай улады, магчыма той, найлепшай, аб якой марыў Сімяон Полацкі.

СПАСЫЛКІ.

1. Симеон Полоцкий. Избранные сочинения. Сост. Еремин И. П. М-Л, 1953.

2. Звонарёва Л. У. Симеон Полоцкий - историк / Беларусіка-Albaruthenica, Мн, 1998, №9, с. 206-220.

3. Орёл российский. Творение Симеона Полоцкого. Сост. Смирнов И. А., М, 1915.

4. Русская силлабическая позия XVII-XVIII вв. Вст. ст. Панченко А. М., Л, 1970.

5. Звонарёва Л. У. Творчество Симеона Полоцкого: истоки, традиции, влияния. Дисс. канд. филолог. наук, Мн, 1988.

6. Коршунов А. Ф. Афанасий Филиппович. Жизнь и творчество. Мн, 1965.

7. Пушкарев Л. Симеон Полоцкий / Русские писатели XVII в. М, 1972, с. 197-335.

8. Симеон Полоцкий. Вирши. Сост. Былинин В. К., Звонарёва Л. У., Мн, 1990.

9. Кулаков В. И. Истоки геральдики российских «выезжих из Пруссии родов / Гербовед, М, 1993, №2, с. 50-61.

10. Витязь С. П. К проблеме древних пруссов в этнической истории Беларуси / Наш радавод. Гістарычная памяць народаў ВКЛ і Беларусі XIII-XX ст.. Гродна, 1996, Кн. 7, с. 163-167.

11. Пузиков В. М. Общественно-политические и философские взгляды Симеона Полоцкого / Из истории философской и общественной мысли Белоруссии: произведения XVI-н. XIX вв., Мн, 1962.

12. Робинсон А. Н. Симеон Полоцкий - астролог / Проблемы изучения культурного наследия. М, 1985, с. 177-184.

13. Голубев И. Ф. Забытые вирши Симеона Полоцкого / Литература и общественная мысль Древней Руси. Труды отдела древнерусской литературы. Л, 1969, т. XXIV, с. 254-259.

АЎТАБІЯГРАФІЧНАЯ ТЭМАТЫКА Ў ВЕРШАХ СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА І БЕЛАРУСКАЯ МЕМУАРЫСТЫКА XVII СТ.

Гаранін С. Л.,
(Мінск)

Зараджэнне ў XVI ст. беларускай мемуарыстыкі было звязана з агульным рэнесансавым працэсам адкрыцця каштоўнасці чалавечай індывідуальнасці. Аднак пашырэнне мемуарнай літаратуры ў Беларусі выпадае на перыяд контррэфармацыі і барока, калі суцэльнасць у выяўленні чалавека страчваецца, а рэнесансавы ідэал асобы распадаецца. Як можна меркаваць па захаваных аўтабіяграфічных сачыненнях той пары (Б. Маскевіч, А. -С. Радзівіл, П. Абуховіч, А. Каменскі-Длужык, Я. Цадроўскі, Т. Білевіч), беларускія мемуарысты заклапочаны, у асноўным, пошукам страчанага маральнага ідэала (які раней увасабляўся ў агіяграфіі і ўвогуле ў рэлігійнай літаратуры). Іх творы выяўляюць спробы аўтараў прадстаць перад чытачом у пажаданых постацях узоравых бацькоў, шляхціцаў, служачых, прыдворных і г. д. Пры гэтым варта нагадаць: у другой палове XVII ст. прага да стварэння розных аўтабіяграфічных нататкаў была ў Беларусі такая, што «... амаль немагчыма было знайсці такой шляхецкай сям'і, у якой не вяліся б свае фамільныя дыярыушы»[1]. Няма сумневу: Сімяон Полацкі як чалавек шырокай літаратурнай эрудыцыі не мог не быць знаёмым з шэрагам вядомых на той час беларускіх і польскіх мемуарных твораў і не зазнаваць пэўнага ўплыву з боку мемуарыстыкі ў цэлым, тым больш, што аўтарам аўтабіяграфічнай нататкі быў і яго блізкі сябра і настаўнік Ігнацій Іяўлевіч.

Паэзія Сімяона Полацкага ў значнай ступені аўтабіяграфічная ўжо ў тым сэнсе, што пепасрэдна звязаная з многімі

рэальнымі падзеямі яго асабістага жыцця і служыць выразам не толькі сацыяльна-палітычных, гістарычных, культурна-асветніцкіх, філасофскіх і педагагічных поглядаў паэта, але і адлюстроўвае змены яго грамадскага становішча. Тым не менш, хаця апавяданне часта ідзе ад аўтарскага імя і формы «я», «мы», «аз» сустракаюцца ў вершах (асабліва панегірычнага, элегеічнага і малітоўнага зместу) амаль трывала, «я» паэта захоўвае рытарычную ўмоўнасць, гэтаксама, як і ў віншавальных творах, напісаных ад імя іншых асоб (замоўшчыкаў). Парой форма «я» мае алегарычнае значэнне. Так, у 11 плачы «Фрэняў... » яна разрастаецца да маштабаў Расіі («Аз - великое Российское Царство, // славное в вере святой Государство»[2]), у гімнаграфічных творах - цалкам умоўнае і павінна ўвасабляць агульныя пачуцці веруючых і да т. п. Твораў непасрэдна аўтабіяграфічнага зместу ў спадчыне Полацкага няшмат. У першую чаргу гэта «Стихи утешные к лицу единому», «Modlitwa w utropieniu», верш у прадмове да «Рыфмалагіёна», а таксама «Siedra nauk wyzwalonych», «Ко государю царю от служащих», «От служащаго», «Воля», «Жизнь», «Предисловие ко благочестивому читателю» ў «Садзе шматколерным» і некаторыя іншыя.

Самавыяўленне ў гэтых вершах звязана з агульнай усходнеславянскай барочнай традыцыяй паказу чалавека, у значнай ступені сфарміраванай у мемуарыстыцы. Як правіла, выява знаходзіцца ў строгіх межах агульнай ідэйнай задумы павучання чытача на ўласным прыкладзе. Таму стыль самавыяўлення пазбаўлены нутраной дынамікі і цапкам падпарадкаваны разумовай логіцы выкладу. Асабліва яскрава бачна гэта ў вершах з прадмовы да «Рыфмалагіёна»:

... Писах в начале по языку тому,
Иже свойственный бе моему дому.
Таже увидев много ползу быти,
Славенскому ся чистому учити.

Взях грамматику прилежах читати,
Бог же удобно даде ми ю знати.
К тому странная сущи ей подобна,
В знании ползу бяше ми удобна.
Тако славенским речем приложихся,
Елико дал Бог знати научихся...[3]

Псіхалагічныя становішчы, уражанні і некаторыя этапы біяграфіі і рысы характару выяўляюцца толькі ў сувязі з агульнай ідэяй, прычым тымі ж прыёмамі, якімі апісваюцца і прадметы, звяры, птушкі, дрэвы, травы, мінералы, фантастычныя істоты, гістарычныя і міфічныя асобы і г. д. Вядома, з пункту гледжання праблемы пранікнення літаратуры ва ўнутраны свет чалавека такі вобразатвор уносіў ў слоўнае мастацтва няшмат новага, але важным было тое, што аўтарская асоба не ідэнтыфікавалася з героем твору.

Выключэнне складаюць два вершы ранняга перыяду творчасці: «Стихи утешные к лицу единому» и «Modlitwa w utropieniu».

Найбольш цікавы першы з іх. Сатырычны элемент у ім прыглушаны, і праз жартоўную форму праглядае сапраўдны клопат паэта пра свой лёс, фармулюецца яго творчае і жыццёвае крэда. Упершыню аўтар ставіцца да сваёй асобы несур'ёзна, стварае з партрэта своеасаблівую гратэскную містыфікацыю. Але, уцягнуты ў «літаратурную гульню», ён цапкам падпарадкоўваецца яе законам: стварэнне вобразу дыктуецца імкненнем да вычварнасці, парадаксальнасці ў развіцці ўнутранага «сюжэту» твора[4].

Іншы характар мае выяўленне пачуццяў у элегіі «Modlitwa w utropieniu». Верш непасрэдна, хацыя і мудрагеліста, нават вычварна, перадае стан чалавека, якому пагражае нейкая небяспека. Напэўна, гэта адзін з нямногіх помнікаў, з радкоў якога паўстае вобраз эгацэнтрыка-інтраверта. Аднак, таксама, як і ў мемуарыстыцы, вобраз аўтара акрэслены агуль-

ДАКУМЕНТЫ ПА ГІСТОРЫІ ПОЛАЦКА Ў КНІГАХ ЗАПІСАЎ МЕТРЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XVII СТАГОДДЗЯ.

Галубовіч В. У.,
(г. Полоцк)

Вывучэнне крыніцазнаўчага аспекта гісторыі беларускага горада, гэтаксама, як і некаторых іншых праблем, з'яўляецца на сенняшні дзень актуальнейшай задачай айчыннай гістарычнай навукі. Узровень распрацоўкі падмурка ўсялякага даследавання - яго крынічнай складаючай - непасрэдна ўплывае на вынікі канкрэтнай працы навукоўца, бо крыніца, па словах знакамітага польскага метадолага гісторыі Е. Тапольскага, з'яўляецца першасным «узроўнем інтэрпрэтацыі рэчаіснасці. » Гэта цудоўна разумелі вядомыя знаўцы полацкай старасвеччыны А. Сапуноў і Г. Харашкевіч, калі рыхтавалі свае зборнікі дакументаў.

За апошнія гады не аднойчы падкрэслівалася значнасць вывучэння для гісторыі Беларусі і непасрэдна Полацка актаў, змешчаных у кнігах канцэлярыі Вялікага княства Літоўскага. Як заўважыу ў свой час З. Даўгяла, з прапрацоўкі актаў Метрыкі фактычна пачалася беларуская навуковая гістарыяграфія. Самымі хуткімі тэмпамі ў XIX-XX стагоддзях ішла праца над матэрыяламі з кніг канцэлярыі па Полацкай гісторыі XV-XVI стагоддзяў. XVII стагоддзю традыцыйна не надавалася вялікая ўвага ізноў жа з шэрагу прычын, галоўнай з якіх была абмежаваная колькасць крыніц, уведзеных у абарачэнне. Тут неабходна падкрэсліць, што менавіта кнігі Метрыкі для ўзнаўлення сюжэтаў з жыцця Полацка ў першай палове XVII стагоддзя ўяўляюць пэўную каштоўнасць. Вядома, што ў выніку падзей 1633 года значны пласт дакументальнай спадчыны быў назаўседы страчаны. Нездарма ў той час сярод шляхты, трэба думаць і мяшчан, панавала пераконанне ў тым, што дакумен-

ты, запісаныя дадаткова ў кнігі Метрыкі, захаваюцца лепей. Гэтак аргументам у 1600 годзе на карысць неабходнасці ўпісання ў кнігу запісаў канцэлярыі ліста княгіні Евы Баркалабаўны Саламярэцкай (Корсак) свайму мужу князю Багдану Саламярэцкаму на маентак Баркулабава ў аршанскім павеце, стала прыгадванне спалення і вываза ў Маскоўскую дзяржаву запісаў і прывілеяў на маемасць пасля захопу замка полацкага [НГАБ, КМФ-18, воп. 1, аа. 71]. Такім чынам, можна меркаваць, што Полацк на пачатку XVII стагоддзя не ўяўляў сабоў бяспечнага месца для захавання дакументаў.

З мэтай высвятлення каштоўнасці для гісторыі Полацка першай трэці XVII стагоддзя аўтарам былі прапрацаваныя кнігі запісаў № 85, 86, 88, 89, 91, 92, 93, 94, 95, 96, 99. Варта зазначыць, што колькасна і якасна дакументы ў згаданых кнігах размешчаны нераўнамерна, а вынікае гэта з характару дзейнасці канцэлярыі і фармавання яе архіва. Некаторыя кнігі ўтрымліваюць вельмі неістотны «полацкі» матэрыял, ці нават яго ігнаруюць[кн. запісаў №94].

Класіфікаваць дакументы па гісторыі Полацка з згаданых вышэй кніг магчыма толькі часткова, бо яны не ахопліваюць усяго відавага спектру прадукцыі вялікакняскай канцэлярыі. Большасць актаў афармляе пэўнай асобе, ці групе жыхароў горада, правы, ільготы і г. д. Шэраг актаў датычыць усяго горада. Колькасна прадстаўлена група актаў, фіксаваўшых пераход пасадаў у горадзе, ваяводстве ад адной асобы да другой.

Асноўную частку насельніцтва горада складала мяшчанства, але нельга адзначыць, каб кнігі запісаў за першую трэць XVII стагоддзя былі багатыя на адпаведны матэрыял. Звесткі пра мяшчан сустракаюцца пераважна ў сувязі з продажам ці набыццем маемасці. Адным з першых за разглядаемы перыяд упісаны дазвол Яну Рагульскаму купіць маентак Driчане на Ушачы, які належыў полацкаму мешчаніну Васілю Нізкаму. У тэксце дакумента прысутнічае абгрунтаванне неабходнасці здзелкі. Васіль Рыгоравіч Нізкі, з'яўляючыся рамеснікам - краўцом, не меў магчымасці жыць на весцы, да таю ж,

яму патрабаваліся грошы, а гаму папрасіў прадаць маемасць «водлуг права посполитого» разам з ворнай зямлей і людзьмі на «земли оселыми». Пры гэтым ліст дазваляў Рагульскаму на будучыню набываць землі на Ушачы ў полацкіх мяшчан [НГАБ, КМФ-18, воп. 1, аа. 141адв.]. Імя іншага полацкага мешчаніна Яна Кардаша, дарэчы таксама краўца, прыгадваецца ў дакуменце датаваным 1. 12. 1605 года сярод тых, хто прадаў свае дамы полацкім езуітам [Там жа, аа. 376-376 адв.]. Яшчэ адзін дакумент - пацверджанне Рыгору Шчыту Забелскаму [Там жа, аа. 333адв.] на зямлю слуг путных полацкіх над возерам Нешчарда сведчыць, што дадзеная маемасць была заменена на пяць пляцоў у Полацку, якія ен атрымаў у спадчыну. Забудаваўшы і засяліўшы гэтыя пляцы, полацкія мяшчане, каб кампенсаваць Шчыту страты, праз падскарбія Вялікага княства Літоўскага прапанавалі ўзамен зямлю слуг путных полацкіх Манеўчызна на возеры Нешчарда. Факт магчымасці такой аперацыі сведчыць пра досыць гнуткую схему маемасных дачыненняў у Полацку XVII стагоддзя. 3 іншага боку шляхта імкнулася па магчымасці атрымаць ад караля правы на валоданне памяшчанскай маемасцю ў горадзе. Слушным прыкладам можа быць ліст ад 25. 03. 1625 года пану Даніэлю Шчыту Забелскаму, падсудку полацкаму, на маемасць трох мяшчан Полацка [Там жа, спр. 99, аа. 129-129адв.].

Цікавасць выклікае шэраг дакументаў, адрасаваных полацкім рамеснікам. Першы з іх, размешчаны ў кнізе № 85- аа. 376-376 адв., пазначаны як прывілей, другі знаходзіцца на арк. 235-236 адв. кнігі запісаў № 88 і называецца «Порадок цеховый ремесником в Полоцку». Абодва датаваныя снежнем 1605 г. Прывілей быў дадзены кавалям, катлярам, слесарам, мечнікам, залатарам, краўцам, кушнерам, шаўцам і іншым на цэх, альбо «брацтва их(«, пасля таго, як «у року прошлом» 1601 8 жніўня яны прасілі ўстанавіць парадак, які «з немецка цехом называють». Але з'яўленне паралельна прывілею ліста, рэгулюючага цэхавы парадак у Полацку, сведчыць, што першапачатковы намер стварыць яго зыходзіў ад рамеснікаў, спецыялізаваўшыхся па металаапрацоўцы, якім, дарэчы, пры-

вілей і быў пераважна адрасавапы. Таму «Порадок(цеховый» дадаткова афармляе цэхавую арганізацыю краўцам, кушнерам, шапашнікам, гарбарам, злотнікам. Працэс далейшай дыферэнцыяцыі цэхавага ладу ў Полацку адлюстроўвае прывілей «kusznierzom у czapnikom» ад 3. 04. 1619 года на стварэнне цэха[Там жа, спр. 96, аа. 56-58].

Агульным для ўсіх мяшчан з'яўляецца запісаны ў кнізе №91 аа. 186 прывілей 1613 года на вольнасць ад выплочвання ўсіх павіннасцяў чатыры гады ў сувязі з пажарам, які спустошыў горад.

Шматлікія фіксацыі ў Метрыцы лістоў на атрыманне ці замену земляў, дамоў, агародаў і г. д. не толькі дазваляе высветліць старых і новых уладальнікаў, але і лакалізаваць у горадзе месца, пра якое ідзе гаворка. Ілюстрацыяй апошняга могуць быць два дакументы, змешчаныя ў кнізе запісаў №85: прывілей на незабудаванае месца полацкім езуітам і пацверджанне ім на дамы і «пляцы» набытыя ў мяшчан і шляхты з дакладным апісаннем размешчання маемасці па вуліцах[Там жа. спр. 85, аа. 375адв. -376, 376-376адв.]. Дадзеныя лісты паказваюць шляхі пашырэння маемасці езуітаў у Полацку. Праўда, адначасова езуіты пазбавіліся яе ў ваяводстве, як гэта было ў 1606 годзе, калі гараднічаму віцебскаму Мікалаю Васілевічу Васілеўскаму прадалі зямлю ля сяла Аўдзеевічы[Там жа, спр. - 85, аа385адв. -382адв.].

Метрыка Вялікага княства Літоўскага ўтрымлівае таксама важкі пласт інфармацыі на гісторыі Полацка - прывілеі на пасады ў ваяводстве і горадзе. Непасрэдна апошняга датычыць прывілей ад 24. 01. 1611 года «пану Жукови» на гарадніцтва полацкае [Там жа, спр. 89, аа. 250], прывілей ад 1. 08. 1621 года Янушу Пернаўскаму на вайтоўства полацкае[Там жа, спр. 93, аа. 477адв. -478] і г. д.

Такім чынам, часткова нрадстаўленыя матэрыялы кніг запісаў канцэлярыі Вялікага княства Літоўскага могуць істотна ўдакладніць і пашырыць веды па самых разнастайных аспектах гісторыі Полацка першай трэці XVII стагоддзя, а асабліва, эвалюцыі мяшчанскага і шляхецкага землеўладання ды рамяства.

ными арнаментальнымі лініямі.

Такім чынам, можна меркаваць, што агульныя прынцыпы стварэння аўтарскага вобразу у тагачаснай мемуарыстыцы былі ўспрыняты, выкарыстаны і творча пераўвасоблены Сімяонам Полацкім у кірунку стварэння не дакументальнага, а мастацкага вобразу аўтабіяграфічнага персанажу, хаця ёсць несумнеўная сувязь яго твораў з падзеямі рэальнай біяграфіі творцы.

ЛІТАРАТУРА

1. Коршунов А. Ф. Историко-мемуарная литература // История белорусской дооктябрьской литературы. - Мн.: Наука и техника, 1977. - С. 206.
2. Симеон Полоцкий. Вирши / Сост., подгот. текстов, вступ. ст. и комм. В. К. Былинина, Л. У. Звонарёвой. - Мн.: Маст, літ., 1990. - С. 316.
3. Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры / Склад. А. Ф. Коршунаў. - Мн.: Дзяржвучпедвыд, 1959. - С. 337-338.
4. Шэраг паралеляў можна бачыць пры гэтым з сатырычнымі творамі XVII ст. «Прамовай Мялешкі» і асабліва «Лістом да Святога Пятра».

МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА СЯМ'І СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА.

Гардзееў М. Ю.,
(г. Мінск)

Інфарматыўная каштоўнасць тэстамента маці Сімяона Полацкага - Таццяны Якаўлеўны Шарамет (Сітняновіч-Пятроўскай па першаму мужу Габрыэлю), які быў выяўлены пры апрацоўцы актавай кнігі полацкага магістрату за 1656-1657 гг., дазваляе нам не толькі істотна ўдакладніць сямейную гісторыю слыннага дзеяча, але і скласці даволі дакладнае ўяўленне аб матэрыяльным становішчы яго сям'і. Нагадаем, яе склад у выніку папярэдніх даследаванняў быў вызначаны наступным чынам. У Т.Я. Шарамет было 5 сыноў: Сільвестр, Самуіл (Сімяон), Ян, Лукаш - ад Габрыэля Сітняновіча-Пятроўскага, і Ян - ад Емельяна Шарамета, полацкага райцы, які яшчэ ў ліпені-пачатку жніўня 1654 г. па невядомых прычынах паехаў у Маскву і на час складання тэстаменту ў Полацк не вярнуўся. У яго было трое дзяцей ад першага шлюбу - Андрэй, Кацярына і Палонія (жонка Пятра Керкажыцкага)[1].

У гэтай працы мы спрабуем даследаваць два аспекты вышэйазначанай праблемы: фінансавае становішча бліжэйшых родзічаў Сімяона і аб'екты нерухомасці, якімі яны валодалі. Акрамя вышэйзгаданага тэстамента выкарыстоўваюцца іншыя акты полацкай магістрацкай кнігі за 1656-1657 гг.

Аб памерах абаротаў грашовых сродкаў у сям'і Шараметаў удалося сабраць наступныя дадзеныя: 1) Шараметы выкупілі з расійскага палону некалькіх полацкіх мяшчанак (31 копа гр. літ.); 2) 12 коп гр. літ. пазычыў у іх А. Мікуліч; 3) 30 талераў аддана на выкуп з палону шляхцянкі Г. Чаркас (Пчыцкай па дзявочаму прозвішчу); 4) сам Е. Шарамет даў сваёй дачцэ Кацярыне 30 (ці 14) коп гр. літ. на набыццё тка-

піны; 5) невядомая колькасць наяўных грошай была аддадзена райцай дзецям і зяцю дзеля вывазу ў Літву падчас наступлення на Полацк царскай раці; 6) «своею працою» Т. Я. Шарамет «през тры годы [маецца на ўвазе перыяд ад ад'езду мужа да часу складання тэстаменту - 8 ліпеня 1657 г. - М. Г. } заробила и набыла» 18 коп гр. літ.; 7) болей за 50 коп гр. літ. быў вінен маці Сімяона яе брат Фёдар; 8) пэўную суму быў вінен П. Астапавіч (памер доўга не адзначаны); 9) пан Крыштаф Рыпінскі быў вінен 2 злотых, а яго родзіч Аляксандр Рыпінскі - 5 коп гр. літ. «за страву сына его м(и)л(о)сти»; 10) на 46 коп гр. літ. Т. Я. Шарамет прадала два кані, частку адзення і зброі 11) згаданы не поўнасцю вернуты доўг мужа ў 100 коп гр. літ.; 12) перабудова дома «свежо своим коштом» абышлася Т. Я. Шарамет у 60 коп гр. літ. Тэстамент адзначае значнае пагаршэнне ўмоваў жыцця сям'і падчас вайны, што, аднак, не было выключэннем, а, хутчэй, агульным правілам дпя жыхароў Полацка. Тым не менш, Т. Я. Шарамет здолела нейкі час карміць сына А. Рыпінскага[2].

Часткова ўдалося вызначыць тую нерухомасць, якой валодала сям'я Шараметаў. Часткова таму, што ў тэстаменце не называюцца аб'екты, якія былі ўнесеныя ў інвентар маёмасці Е. Шарамета, што яго жонка прыкладала да тэстаменту[3]. Дарэчы, такая з'ява, як прыкладанне асобнага інвентара, была ўласціва звычайна толькі заможным шляхецкім сем'ям. Тэстаменты палачанак, якія займалі роўнае з Т. Я. Шарамет сацыяльнае становішча (з сем'яў бурмістраў і райцаў), не маюць звестак пра асобныя інвентары[4].

Дом, у якім наведвала маці Сімяона магістрацкая камісія, знаходзіўся на вуліцы Вялікай, дзе пражывала ў асноўным сацыяльная вярхушка палачан, і названы ён яе домам. Хутчэй за ўсё, стаяў ён, аднак, на зямлі Е. Шарамета. Вядома таксама, што сынам Т. Я. Шарамет ад першага шлюбу (Сільвестру, Самуілу (Сімяону), Яну і Лукашу) належал «кгрунт до-

мовый», але Шарамет прадаў яго за 20 коп гр. літ.[5] Такіх участкаў для забудовы ў сям'і было, верагодна, некалькі, бо ў тэстаменце згадана таксама зямля, на якой Шарамет жыў 20 гадоў і які быў незаконна прысвоены ў яго адсутнасць у Полацку А. Карзевічам[6]. Па асобнаму дакументу - скарзе Т. Я. Шарамет на полацкага мешчаніна А. Хоміча ад 10 мая 1657 г. аб незаконным узаранні аднаго з двух агародаў нябожчыка Р. Бухалы, які быў вінен Е. Шарамету 80 коп гр. літ. па даўгаваму абавязацельству, можна ўстанавіць, што Шараметы прэтэндавалі і на гэтыя ўчасткі зямлі[7]. Але паводле жалаванай граматы цара Аляксея Міхайлавіча Полацку ад 7 верасня 1654 г. усе справы аб даўгах адтэрміноўваліся да 1 верасня 1657 г. [8], і агароды не былі аддадзены Таццяне Якаўлеўне.

Да таго, у сям'і з вялікай адказнасцю ставіліся да ўліку матэрыяльных каштоўнасцей, аддаючы перавагу пісьмовым сродкам. Вышэй ужо адзначаўся факт прыкладання да тэстаменту асобнага інвентара (гл. спасылку 3). Усе фінансавыя дакументы: справы, рэестры, даўгавыя абавязацельства як другога, так і першага мужа Т. Я. Шарамет захоўваліся ў Лукаша, які ў той час быў падпіскам у магістраце, а пазней стаў і пісарам[9]. Аб адказным стаўленні да гэтай праблемы гаворыць таксама акт аб унясенні Т. Я. Шарамет скаргі на Андрэя і Кацярыну Шараметаў, Пятра і Палонію Керкажыцкіх, якія не вярнулі ўсе дадзеныя «до вывезеня» рэчы, калі прыехалі ў Полацк са «збегов военных». У скарзе маці Сімяона абяцала падаць спіс гэтых рэчаў у пісьмовым выглядзе[10].

Неудакладнёным застаецца пытанне аб роднаснай прыналежнасці да Шараметаў і Сітняновічаў-Пятроўскіх яшчэ трох асоб (і, адпаведна, іх зямельных уладанняў): Аўдоцці Шатроўны Максімавай Чаронкавай, як яе называе дакумент, Даніэля і Арцёма Сітняніновічаў (сына і ўнука вышэйзгаданай асобы). Захаваўся дакумент аб судовым разбіральніцтве па скарзе Аўдоцці на лаўніка І. Зімніцкага аб незаконным «запахане» на-

лежачага спадчынным правам Арцёму ад бацькі «мейсца голого домового на улицы Ильлиньской». Атрымалася так, што ўчастак быў аддадзены магістратам Зімніцкаму, і той нават паспеў зрабіць «перед тою землею на улицы мост». Даніэль к таму часу ўжо памёр, а Арцём хаваўся недзе ў Літве ці Інфлянтах ад маскоўскіх войскаў. Бабка была адзінай з бліжэйшых родзічаў, якія мелі права «владеть и заведывать тымь кгрунтомь», што і было пацверджапа магістратам[11]. Здзіўляе невялікая розніца ў напісанні прозвішчаў - прысутнасць у Даніэля і Арцёма дзвюх іншых літар пры поўным супадзенні астатніх частак слоў. Цікава, што з'явілася на пасяджэнне магістрату ў ратушы Аўдоцця ні з кім іпшым, як з «прыятелем своим паном Лукашом Пютровским-Ситняновичомь». Тое, што падпісак анансаваны як «прыяте[л]», з'яўляецца адзіным фактам, які не дазваляе з вартай упэўненасцю лічыць Сітняніновічаў родзічамі Сімяона (нават дапускаючы і памылку пісара). Дарэчы, Лукаш параўнальна часта з'яўляецца ў магістрацкіх актах як чый-небудзь «прыятел» на судах, верагодна, як лаббіст гандлёва-фінансавых інтарэсаў тых, з кім ён «становился очевисто» перад магістратам[12].

Па прыведзеных звестках, сям'я Сімяона брала даволі актыўны ўдзел у фінансавых стасунках сярэднявечнага Полацка, дыспанавала значнымі грашовымі рэзервамі. Дакументы сведчаць аб яе заможнасці, напрыклад, спісамі хатніх рэчаў, адзення і г.д., што можа быць тэмай для асобнага даследавання. Да таго, сям'я валодала некалькімі зямельнымі ўчасткамі ў горадзе. Яе члены - Емельян Шарамет і Лукаш Сітняновіч-Пятроўскі - займалі важныя і ўплывовыя пасады ў органах гарадскога самакіравання.

Падводзячы вынікі, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што сям'я Сімяона Полацкага ў сярэдзіне XVII ст. мела трывалыя пазіцыі ў фінансава-эканамічных і сацыяльных адносінах Полацка і можа быць прылічана да тагачаснай гарадской

эліты. Гэтае асяродцзе было моцным пазітыўным фактарам, што адыграў сваю ролю ў фармаванні таго Сімяона Полацкага, якім зараз ганарыцца ўсходнеславянскі свет.

ЛІТАРАТУРА

1. Гордеев М. Ю. Новые данные к биографии Симеона Полоцкого завещание матери просветителя. // Славяноведение. - № 2. - 1999. - С. 37-47.
2. Нацыянальны гістрычны архіў Беларусі (далей - НГАБ), ф. 1823, воп. 1, спр. 1, арк. 471-474 адв.
3. Тамсама, арк. 471-471 адв.
4. Тамсама, арк. 54-55 адв., 98-99.
5. Тамсама, арк. 473 адв.
6. Тамсама, арк. 474.
7. Тамсама, арк. 396 ада.
8. Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов. В 3-х т. Т. 2. - Мн., 1960. - С. 83.
9. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, спр. 1, арк. 471 адв.; Татарский И. Симеон Полоцкий: (Его жизнь и деятельность). Опыт исследования из истории просвещения и внутренней церковной жизни во вторую половину XVII века. -М. 1886. -С. 204.
10. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, спр. 1, арк. 48-48 адв. п Тамсама, арк. 371-371 адв. \1Напрыклад: Тамсама., арк. 187, 192.

ПРОСВЕТИТЕЛЬСКАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ СИМЕОНА ПОЛОЦКОГО И ПРОЕКТ ВЫСШЕГО УЧЕБНОГО ЗАВЕДЕНИЯ

Краско О. Д.,
(г. Полоцк)

Во второй половине XVI века в Москве возникла необходимость создания учебных заведений, которые бы готовили широко образованных служителей и деятелей церкви и государства. В XVII в. появляется несколько школ и училищ, где среди прочих предметов преподавались история, философия, пиитика, греческий, латинский языки и т. д. С течением времени возникла необходимость создания Высшего учебного заведения в России. В 1687 году в Заиконоспасском монастыре на основе Типографской и Богоявленских школ было открыто училище, которое явилось наивысшим достижением в области просвещения в России XVII века. Это училище стало именоваться Эллино-греческой, Славяно-латинской, а затем Славяно-греко-латинской академией.

Проект этой академии в последние годы жизни был составлен нашим земляком Симеоном Полоцким. Его просветительская деятельность была неразрывно связана с процессом становления образования западнического европейского образца. На протяжении всей своей жизни в Москве Симеон осознавал необходимость образования, о чём постоянно пишет в стихах, провозглашает в проповедях. Так, в слове на день Рождества Христова проповедник от лица патриарха именем божией премудрости умоляет русских людей взыскать науку, «потому что она свет умственных очей и правило всему житию человеческому». Обращаясь от лица патриархов к царю, он убеждает его основывать школы, умножать спудеев

(студентов) своей милостью и вниманием, сыскать хороших учителей и всеми почестями поощрять к трудолюбию. В своих проповедях Симеон Полоцкий нападал на старых учителей, обвиняя их в невежестве. Но одними обличениями нельзя было вдруг сделать всех образованными. Поэтому назрел проект высшего учебного заведения, что явилось как-бы венцом всей просветительской деятельности Симеона Полоцкого.

Проект будущей академии был составлен по образцу белорусской и украинской высшей школы. Эта была только общая схема будущей академии, и составлен проект был от имени царя. В начале документа говорится о том, что царь, вступив на престол, подобно Соломону, ни о чём не хочет так заботиться как о мудрости. Как Соломон устроил семь училищ, так и Фёдор намерен устроить в Заиконоспасском монастыре академию, в которой бы обучали семи свободным наукам, Это были науки, разрешенные к преподаванию православной церковью. Запрещена была только естественная магия. В проекте оговаривалось количество предполагаемых изучаемых предметов, обязанности учителей и учеников. Для школы предлагалось выделить отдельное строение, были даны монастыри Спаса в Китай-городе близ Неглинных ворот (Заиконоспасский), Иоанна Богослова в уезде Переяславля Рязанского, ибо Иоанн Богослов почерпнул мудрость небесную от источников премудрости; Андреевский на Москва-реке, ибо этот монастырь основан Ртищевым для учебного братства; монастырь Данилов на Москва-реке и ещё четыре монастыря со всеми крестьянскими дворами и со всеми угодьями. Кроме того, от своего имени царь дан Вышегородскую дворцовую волость и десять пустошей в разных местах. Таким образом, предполагалось отпустить значительные средства, и позволено было всякому частному лицу жертвовать на одежду и пищу ученикам. Блюститель и учителя должны были быть благочестивые и от благочестивых родителей рожденные и воспитан-

ные в православной вере российского и греческого народа, Оговаривалось, что из греков могут быть допущены только те, которые принесут от вселенских патриархов достоверное свидетельство «о крепком утверждении своем в восточной вере» Новообращенные из римской веры, а также из лютеранской и кальвинской и других ересей, как говорится в документе, не допускаются в блюстители и учителя. Проект также рекомендовал очень осторожно относиться к учителям из Литвы и Малороссии, и рекомендовал не верить их словам без свидетельства благочестивых людей и не ставить их в блюстители и учителя. Блюстители и учителя должны крепко и нерушимо охранять и защищать православную веру от всяких ересей. В случае нарушения клятвы предусматривалось наказание (лишение чина учительского, сожжение на костре). Запрещалось иметь домашних учителей иностранных языков, ибо от них может быть вред православной вере. Академия должна была блюсти за тем, чтобы не появлялось противников православной веры. Блюститель должен доносить царю о ересях, наблюдать за поведением всех новообращенных в православную веру, следить за тем, чтобы никто еретических книг и писаний у себя не держал и не читал. Запрещалось вести спор по поводу этих книг, а книги сжигать или приносить блюстителю, Кроме того, блюстителю академии было дано право судить за ереси и приговаривать к сожжению, Из этой привилегии очень хорошо виден господствующий взгляд того времени на науку. Необходимость науки и училища осознана, но осознана она в интересах церкви. Училище устраивается для поддержки православия и становится главным орудием в борьбе против других вер. Таким образом, православная церковь хотела устроить для себя цитадель или инквизиционный трибунал при столкновении с иноверным Западом. Наука призывалась для служения церкви.

Несмотря на такое реакционное отношение право-

славной церкви к другим верам, в проекте есть положения, которые имеют историческую значимость. Во-первых, было предусмотрено, что в академию допускались люди всех сословий и возрастов. Это было существенно для выходцев из народа, которых впоследствии очень много училось в академии. Во-вторых, у учеников были определенные привилегии. Все их поступки рассматривал академический суд. Чтобы не препятствовать науке учеников судил блюститель с учителями. Блюститель, если будет заподозрен в каком-либо преступлении, судится учителями, учитель судится блюстителем и учителями. За долговременную и верную службу учителя получают пенсии. Предусматривались льготы для прилежных учеников. За прилежность в науках, особенно в изучении священного писания и языков, от царя предусматривалось вознаграждение, а по окончании учения пожалование соответствующего чина. В документе оговаривалось, что из неблагородных в государственные чины допускались только за государственные заслуги и после окончания училища. Это способствовало стремлению учиться в данном училище. Учёные иностранцы, приезжавшие в Россию, подвергались испытанию в академии и только после этого принимались за службу.

Проект академии остался только проектом. Царского решения по этому вопросу Симеон Полоцкий не дождался. После смерти Симеона проект был подписан, но остался только на бумаге. В 1682 году Фёдор Алексеевич умер. Только в 1685 году, когда Сильвестр Медведев познакомил царевну Софью с проектом, к вопросу устройства академии вернулись и первое высшее учебное заведение в Москве было открыто.

МИРОВОЗЗРЕНИЕ СИМЕОНА ПОЛОЦКОГО КАК ИСТОЧНИК ИДЕЙ СОВРЕМЕННОГО ОБРАЗОВАНИЯ И ВОСПИТАНИЯ

Крачак О. Е.,
(г. Минск)

Обращение к творчеству Симеона Полоцкого особенно интересно для нас, потому что, как и мы сейчас, он жил в период истории, названный переходным.

Симеон Полоцкий интересен для нас как духовный, ориентир, потому что в условиях переходной эпохи он смог выработать единую мировоззренческую позицию.

